Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца
з 9 жніўня 1917 г.

8 КРАСАВІКА 2016 г. ПЯТНІЦА № 65 (28175) Кошт 2100 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Фея, якая нясе дабрыню**

СТАР. 5



**Чаму мужчыны жывуць менш за жанчын?**

СТАР. 13



**Праграма тэлебачання**

**20 КАНАЛАЎ**

## З ДОБРЫМІ НАВІНАМІ



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Жыхарка вёскі Ленін Жыткавіцкага раёна Наталля РЫДЗЕЦКАЯ чатыры гады працуе паштальёнкай у мясцовым аддзяленні сувязі.**

*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Валерый ЦАПКАЛА, дырэктар адміністрацыі ПВТ:**

*«Калі мы дзесяць гадоў таму пісалі абгрунтаванне аб стварэнні Парка высокіх тэхналогій, то запланавалі за дзесяцігоддзе дасягнуць экспарту ў $300-350 млн. І тады гэта здавалася вельмі аптымістычным прагнозам. Па 2015 годзе экспарт склаў ужо больш за $700 млн, а калі мы будзем трымаць тэмпы росту, якія ў нас былі на працягу папярэдніх дзесяці гадоў, то сёлета наблізімся да $1 млрд. Экспарт камп'ютарных паслуг на душу насельніцтва ў 2015 годзе ў Беларусі склаў $74, што з'яўляецца вельмі высокім паказчыкам у свеце. Акрамя таго, чатыры нашыя кампаніі-рэзідэнты ўваходзяць у спіс ста найбуйнейшых сусветных аўтсорсінгавых кампаній, а каля 1 млрд чалавек у 150 краінах карыстаюцца беларускімі мабільнымі праграмамі».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 8.04.2016 г.

| | |
|---|---|
| Долар ЗША | 20092,00 ▼ |
| Еўра | 22883,00 ▼ |
| Рас. руб. | 296,38 ▲ |
| Укр. грыўня | 778,76 ▼ |

ISSN 1990 - 763X

■ Тэхналогіі

## ШЛЯХ У ВІРТУАЛЬНЫ СВЕТ?

### Варта толькі надзець акуляры

**Чалавецтва на парозе новай віртуальнай рэвалюцыі. Відэагульні, фільмы, сацыяльныя сеткі ды і ўвесь інтэрнэт з плоскасці манітора ў хуткім часе перавандруе ў аб'ёмную віртуальную праекцыю. Убачыць лічбавае асяроддзе па-новаму дапамогуць акуляры віртуальнай рэальнасці, якія ўжо сёлета павінны стаць даступнымі для шырокай аўдыторыі. Улічваючы, што ўзровень графікі штогод становіцца ўсё больш рэалістычным, неўзабаве стане важным умець адрозніваць сапраўдны свет ад уяўнага.**



### НОВАЯ НІША ДЛЯ КАНКУРЭНЦЫІ

Цалкам лагічна, што на Сусветным мабільным кангрэсе, які адбыўся 22-25 лютага ў Барселоне, найбольшую ўвагу павінны былі надаць новым смартфонам. Але, як аказалася, гэта было не самае дзіўнае для тых, каму пашчасціла там пабываць. Па звестках розных крыніц у глабальным сеціве, позіркі многіх відавочцаў былі прыкаваныя менавіта да новага трэнда гэтага года — віртуальнай рэальнасці (VR). Ужо цяпер яна ўсё больш інтэгруецца ў смартфоны і інтэрнэт. І калі яшчэ не так даўно віртуальны свет быў толькі атрыбутам камп'ютарных гульняў, то цяпер ён усё часцей выкарыстоўваецца для іншых, больш практычных мэт. Сюды варта аднесці і новыя прыкладныя праграмы для VR у сферы адукацыі, навучання і нават у гандлі, якія з'явіліся не так даўно.

СТАР. 4

■ Надвор'е

## ПРЫПЯЧЭ ПА-МАЙСКУ

### Сёння ўдзень на поўдні краіны чакаецца да 27 цяпла

**А на выхадныя ў нас будзе сапраўды цёпла, аднак часам паўсюдна пройдуць кароткачасовыя дажджы, паведамляюць спецыялісты Белгідраметцэнтра.**

Максімальную цеплыню ў першай дэкадзе красавіка айчынныя сіноптыкі чакаюць менавіта ў пятніцу. У гэты дзень тэрыторыя краіны апынецца пад уплывам франтальных раздзелаў, якія рухаюцца з паўднёвага захаду Еўропы. Таму на большай частцы Беларусі пройдуць кароткачасовыя дажджы рознай інтэнсіўнасці, месцамі прагрымяць навальніцы. Максімальная тэмпература паветра складзе ад плюс 15 градусаў да 21 цяпла, у паўднёва-ўсходніх раёнах — месцамі да 27 градусаў. Аднак па паўночным захадзе падчас дажджоў месцамі тэмпература складзе да 14 цяпла.

Даволі няўстойлівая і вельмі цёплая паветраная маса будзе паступаць да нас на выхадныя з боку паўднёвага захаду Еўропы. У суботу на працягу сутак, у асноўным па паўночным захадзе, пройдуць кароткачасовыя дажджы, у асобных раёнах — з навальніцамі. Тэмпература паветра ўначы складзе плюс 6-13 градусаў, удзень ад 17 да 23 цяпла, а па паўднёвым усходзе — да плюс 25 градусаў. У паўночна-заходніх раёнах будзе свяжэй — плюс 10-16 градусаў.

Амаль паўсюдна чакаюцца кароткачасовыя дажджы і ў нядзелю. У асобных раёнах прагрымяць навальніцы. Тэмпература паветра ўначы будзе плюс 7-13 градусаў, удзень — ад 17 да 23 цяпла, па паўднёвым усходзе — да плюс 25 градусаў. На захадзе — толькі плюс 10-16 градусаў.

СТАР. 3

# ПРАЦА НА ВЫНІК

## Інвестыцыі для развіцця беларускага машынабудавання будуць прадастаўляцца толькі пад канкрэтныя рынкі збыту

**Аб гэтым заявіў Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка ў час наведвання ААТ «Мінскі аўтамабільны завод» — кіруючая кампанія холдынга «БелаўтаМАЗ», перадае карэспандэнт БЕЛТА.**

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што любыя фінансавыя рэсурсы, асабліва крэдытныя, прадпрыемствы змогуць атрымаць толькі пасля дакладнага падліку патэнцыяльных рынкаў збыту новай прадукцыі. «Неабходна дакладна разумець, што калі бераце грошы пад нейкі прадукт, то павінны даказаць, што, вырабіўшы яго, заўтра прадасце», — заўважыў беларускі лідар. Што датычыцца холдынга «БелаўтаМАЗ» і яго галаўной кампаніі, генеральны дырэктар Дзмітрый Кацярыніч запэўніў Прэзідэнта, што ў бягучым годзе плануецца выйсці на эфектыўную работу. Дзякуючы аказанай у 2015 годзе дзяржпадтрымцы ўдалося вырашыць шэраг фінансавых праблем, нарасціць аб'ёмы вытворчасці, знізіць запасы гатовай прадукцыі на складах, павялічыць экспарт. Усяго прадпрыемства ажыццяўляе пастаўкі ў больш як 30 краін свету. У 2016 годзе плануюцца пастаўкі прадукцыі на новыя рынкі збыту, у тым ліку ў Лаос, Філіпіны, Інданезію, Зімбабвэ, Судан, Эквадор, Аман. Паступова пашыраецца і таваправодная сетка.

Акрамя дзяржпадтрымкі ў мінулым годзе ў ААТ «МАЗ» рэалізаваны комплекс антыкрызісных мерапрыемстваў для выхаду на дадатны вынік работы. Іх агульны эканамічны эфект склаў каля Br1,5 трлн. Ёсць план па зніжэнні затрат і на 2016 год. Гаворачы аб асваенні новых рынкаў збыту, Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што ўжо даўно і настойліва ставіць адпаведную задачу. Кіраўнік дзяржавы лічыць, што яшчэ адной умовай для павышэння канкурэнтаздольнасці беларускай тэхнікі павінна быць працяглая гарантыя вытворцы. «Дайце 5 гадоў гарантыі. Калі што-небудзь зламалася, то хутка замяніце. Ёсць сэрвісныя цэнтры», — сказаў ён.

Аляксандр Лукашэнка акцэнтаваў увагу, каб пры замежных пастаўках не выкарыстоўваліся нейкія сумніўныя схемы і пасрэдніцкія структуры, у выніку чаго ўзнікнуць праблемы з вяртаннем грошай за прададзеную тэхніку. А такія прыклады, на жаль, ёсць.

«Вы — дзяржаўнае прадпрыемства. Ад вас мінімум што просяць — захаваць працоўныя калектывы, плаціць зарплату, вырабляць добры тавар і прадаваць яго», — сказаў Прэзідэнт, звяртаючыся да Дзмітрыя Кацярыніча. У цэлым прадпрыемства склала сур'ёзныя планы па далейшым развіцці. Кіраўніку дзяржавы далажылі аб інвестпраекце па мадэрнізацыі і рэканструкцыі вытворчасці прадпрыемстваў холдынга тэрмінам рэалізацыі ў 2016—2022 гадах. Капітальныя затраты на яго рэалізацыю складуць $427,1 млн, а тэрмін акупнасці — амаль 10 гадоў. Адносна гэтага Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што грошы будуць выдзяляцца толькі пад эфектыўныя праекты з дакладна падлічанымі патэнцыяльнымі рынкамі збыту. «Спачатку — рынак, а далей — інвестыцыі. Будзе рынак — будзем весці размову аб $0,5 млрд», — папярэдзіў Прэзідэнт.

Мінскі аўтамабільны завод, таксама як і іншыя вядомыя беларускія брэнды, неабходна захаваць. «Перш за ўсё вы павінны захаваць гэта прадпрыемства. Яго неабходна абнавіць, наколькі гэта магчыма, надаць яму новае аблічча. З канвеераў павінны сыходзіць поўнасцю беларускія машыны найвышэйшай якасці», — заявіў беларускі лідар.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што забеспячэнне высокай якасці прадукцыі — гэта ў першую чаргу задача ўсяго працоўнага калектыву. Ён адзначыў, што ў гэтай частцы да работнікаў дылерскай сеткі часам паступаюць аб'ектыўныя нараканні. «Калі вы, кожны на сваім рабочым месцы, не зоймецеся якасцю, мы не вытрымаем канкурэнцыі», — сказаў Прэзідэнт. — Мы павінны захаваць гэты завод і павысіць якасць». Кіраўнік дзяржавы канстатаваў, што ў цяперашніх эканамічных умовах прадпрыемства сутыкаецца з шэрагам цяжкасцяў. Адначасова ён паставіў задачу не дапусціць пагаршэння сітуацыі, чаго б гэта ні каштавала.

«МАЗ, як і БелАЗ, і мотавелазавод, — гэта твар нашай краіны. Мы ні ў якім разе не можам і не маем права загубіць гэтыя прадпрыемствы. Таму, адказваючы скептыкам і тым, хто сёння не верыць у гэта: МАЗу быць, быць заўсёды, і пры мне, і пасля мяне», — заявіў кіраўнік дзяржавы.

Захаванне гэтых і іншых прадпрыемстваў, падкрэсліў Прэзідэнт, гэта справа не толькі яго гонару, але і захаванне эканамічнай базы, рабочых месц для будучых пакаленняў. «Наша шчасце тут, на гэтай зямлі. І мы павінны думаць аб тым, як захаваць рабочае месца для нашых дзяцей», — рэзюмаваў Аляксандр Лукашэнка.

Як далажылі кіраўніку дзяржавы, ёсць канкрэтныя планы па развіцці розных напрамкаў у айчынным машынабудаванні, пачынаючы ад ліцейнай вытворчасці да вытворчасці кранавага абсталявання і пашырэння лінейкі транспарту на газаматорным паліве. Работа ў гэтым напрамку вядзецца, адпаведная беларуская тэхніка ўжо задзейнічана ў пасажырскіх перавозках як у Мінску, так і пастаўляецца ў Расію. Выкарыстанне газу дае магчымасць эканоміць 30-40 працэнтаў на эксплуатацыйных расходах і кошце паліва.

У бліжэйшай перспектыве ў Беларусі плануецца асвоіць вытворчасць аўтацыстэрнаў для звадкаванага газу і запраўшчыкаў, што перспектыўна для пераводу на газавае абсталяванне сельскагаспадарчай тэхнікі. Аляксандр Лукашэнка даручыў наступнай вясной рэалізаваць адпаведны пілотны праект на базе некалькіх перадавых сельгаспрадпрыемстваў, каб на практыцы ацаніць патэнцыяльную выгаду.

Перспектыўным Аляксандру Лукашэнку бачыцца і развіццё сектара электратранспарту, асабліва з улікам з'яўлення дадатковых магутнасцяў з уводам БелАЭС. На МАЗе ўжо вядзецца работа над айчынным электробусам.

Падчас наведвання МАЗа размова ішла не толькі аб развіцці гэтага прадпрыемства. Былі арганізаваны своеасаблівы агляд асноўных прадпрыемстваў беларускага машынабудавання. Аб перспектыўных планах і распрацоўках Прэзідэнту далажылі кіраўнікі БелАЗа, «Амкадора», «Гомсельмаша», МТЗ, «БелДжы». Кіраўнік дзяржавы азнаёміўся з выстаўкай найноўшых узораў тэхнікі гэтых прадпрыемстваў, выстаўкай дэталяў, вузлоў і аўтаагрэгатаў. Акрамя неабходнасці забеспячэння высокай якасці прадукцыі, размова тут вялася і аб рабоце па імпартазамяшчэнні, зніжэнні выдаткаў на вытворчасці, аб павелічэнні долі айчынных камплектуючых.

# БАЗАВЫ ДАКУМЕНТ

## Праект праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны на 2016—2020 гады будзе вынесены на разгляд Усебеларускага народнага сходу

**Для яго распрацоўкі створана міжведамасная рабочая група пад кіраўніцтвам старшыні Савета Рэспублікі Міхаіла Мясніковіча, паведамляе БЕЛТА. Работа гэтай групы пачалася не з чыстага ліста. Летась праект асноўных палажэнняў праграмы разгледжаны і адобраны на пасяджэнні Прэзідыума Савета Міністраў з удзелам вышэйшых службовых асоб, у тым ліку кіраўнікоў абедзвюх палат парламента, Адміністрацыі Прэзідэнта і Камітэта дзяржаўнага кантролю. У першым квартале 2016 года праект праграмы дапрацаваны з улікам даручэння Прэзідэнта і накіраваны ў Адміністрацыю Прэзідэнта.**

Цяпер ідзе работа над стварэннем рабочых груп па падрыхтоўцы і правядзенні чарговага Усебеларускага народнага сходу, якія ў адпаведнасці з зацверджанымі планамі будуць весці арганізацыйную і ідэалагічную работу, рыхтаваць адпаведныя матэрыялы.

Ужо зацверджаны пералік рабочых груп, іх кіраўнікоў і сакратарыята. Першая група — па арганізацыйных пытаннях пад кіраўніцтвам першага намесніка кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Канстанціна Мартыненкі, другая — па ідэалагічным забеспячэнні (намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Ігар Бузоўскі), трэцяя — па каардынацыі работы сродкаў масавай інфармацыі (намеснік прэм'ер-міністра Наталля Качанава), чацвёртая — па рабоце з прадстаўнікамі дыпламатычнага корпуса, беларускіх дыяспар, міжнародных арганізацый і замежнымі гасцямі (першы намеснік міністра замежных спраў Аляксандр Міхневіч), пятая — па матэрыяльна-тэхнічным забеспячэнні (першы намеснік кіраўніка спраў Прэзідэнта Мікалай Селіванаў). Сакратарыят рэспубліканскага арганізацыйнага камітэта па падрыхтоўцы і правядзенні V Усебеларускага народнага сходу ўзначаліць кіраўнік Апарату Савета Міністраў Ігар Сокал.

Нагадаем, што да 15 красавіка на разгляд кіраўніка дзяржавы будуць унесены прапановы аб даце правядзення V Усебеларускага народнага сходу і колькасці яго ўдзельнікаў.

■ Медыяпрастора

Лілія АНАНІЧ:

# «САМАЕ ГАЛОЎНАЕ, КАБ ЖУРНАЛІСТЫКА ЗАСТАВАЛАСЯ СУМЛЕННАЙ»

**Беларусь адбылася як незалежная дзяржава, і толькі беларусы самі заўсёды вырашалі і будуць вырашаць свой лёс. Гэты факт асабліва адзначыла міністр інфармацыі Лілія Ананіч, адказваючы на пытанні журналістаў у час тэлемоста «Мінск—Масква», перадае карэспандэнт БЕЛТА.**

Паводле слоў міністра, інфармацыйная прастора Беларусі сёння адкрытая: у краіне больш як 5 млн карыстальнікаў інтэрнэту. «Мы маем намер пашыраць сваю інфармацыйную прысутнасць усімі даступнымі сродкамі, праз сумесныя інтэграцыйныя праекты ў тым ліку плануем пашырэнне магчымасці па пашырэнні распаўсюджвання інфармацыі пра Беларусь у свеце. Гэта сёння трэба не толькі Беларусі, але і Еўропе, як паказала практыка, — падкрэсліла Лілія Ананіч. — Да нас прыязджаюць еўрапейцы, таму што мы міралюбівая і адкрытая краіна, у нас утульна, прыгожа, спакойна, мы гэтым даражым і будзем нязыхільна гэтага прытрымлівацца. Беларусь заўсёды праводзіла шматвектарную знешнюю палітыку, заўсёды сумленна і адкрыта вуснамі Прэзідэнта гаварыла аб усіх з'явах і працэсах, якія адбываюцца ў свеце. Гэта не асаблівасць, гэта сутнасць і характар беларускай палітыкі і нашага Прэзідэнта».

Беларусь павінна ўзмацняць інфармацыйную прысутнасць у Расіі. Паводле слоў Ліліі Ананіч, сёння ў Беларусі шырока транслююцца расійскія тэлеканалы. «Наш інтэграцыйны клопат — каб у тэлеканала «Беларусь 24» была такая ж шырокая аўдыторыя, як і ў расійскіх тэлеканалаў. Сёння гэтае пытанне на парадку дня абмеркавання па лініі адпаведных ведамстваў», — дадала міністр.

Лілія Ананіч выказала думку, што так званыя інфармацыйныя войны паміж Беларуссю і Расіяй павінны застацца ў мінулым. «Хачу заўважыць, што інфармацыйныя войны сёння існуюць і ў глабальным плане, паміж Захадам і Усходам. Як міністр я буду працаваць над тым, каб інфармацыйных войны былі паміж Беларуссю і Расіяй былі фактам гісторыі», — падкрэсліла яна.

Лілія Ананіч таксама заявіла: «Самае галоўнае, каб журналістыка заставалася сумленнай і непрадузятай. Праўда і нічога, акрамя праўды. Над гэтым трэба добра падумаць журналісцкай супольнасці і ў Беларусі, і ў Расіі. Трэба знаходзіць тое, што кансалідуе і працуе на стварэнне. Шматпалярнасць інфармацыйнага поля — гэта розныя пункты гледжання. Але ўсё, што працуе не на стварэнне, шкодна і для Беларусі, і для Расіі».

■ Знешняя палітыка

# Пасольства ў Ізраілі застанецца

**Пра гэта на брыфінгу паведаміў Дзмітрый МІРОНЧЫК, начальнік упраўлення інфармацыі — прэс-сакратар Міністэрства замежных спраў.**

«Разгледзеўшы атрыманую па дыпламатычных каналах ноту з інфармацыяй аб прынятым прэм'ер-міністрам Дзяржавы Ізраіль рашэнні захаваць прысутнасць у Беларусі ізраільскай дыпламатычнай місіі ў мінулым фармаце, беларускі бок прыняў рашэнне аб захаванні сваёй дыпламатычнай прысутнасці ў Дзяржаве Ізраіль, — заявіў прадстаўнік дыпламатычнага ведамства. — Зыходзім з таго, што падтрыманне адносін паміж Беларуссю і Ізраілем на ўзроўні пасольстваў — гэта аб'ектыўная неабходнасць, абумоўленая цеснымі сувязямі дзясяткаў тысяч людзей, для якіх Ізраіль і Беларусь з'яўляюцца блізкімі і роднымі краінамі, а таксама ў цэлым пазітыўнай дынамікай двухбаковых адносін у розных сферах».

Прэс-сакратар МЗС праінфармаваў таксама пра тое, што на наступным тыдні наша дэлегацыя прыме ўдзел у 49-й сесіі Камісіі ААН па народанасельніцтве і развіцці. Наша краіна з'яўляецца дзеючым членам гэтай Камісіі.

«Спецыяльнай тэмай сесіі стане «Кантроль за ажыццяўленнем парадку дня ў галіне развіцця на перыяд пасля 2015 года: нарошчванне базы дэмаграфічных звестак», — паведаміў Дзмітрый Міронча. — Паколькі тэма 49-й сесіі цесна звязана з ініцыятывамі Рэспублікі Беларусь у ААН па супрацьдзеянні гандлю людзьмі, а таксама па абароне сям'і і сямейных каштоўнасцяў, удзел у працы камісіі будзе спрыяць іх далейшаму развіццю і папулярызацыі».

Прадстаўляць нашу дзяржаву на мерапрыемстве будзе намеснік міністра замежных спраў Валянцін Рыбакоў.

Як паведамляецца, нашы дыпламаты плануюць правесці на палях сесіі шэраг дадатковых мерапрыемстваў, спадарожных заяўленай тэматыцы. «Гэта мерапрыемства з нагоды 70-годдзя Адміністрацыі дапамогі і аднаўлення Аб'яднаных Нацый, якая працавала ў Мінску непасрэдна пасля вайны, — зазначыў прадстаўнік знешнепалітычнага ведамства. — Акрамя таго, адбудзецца мерапрыемства Групы сяброў, якія аб'ядналіся ў барацьбе з гандлем людзьмі — на гэтай сустрэчы ўдзельнікі абмяркуюць выкарыстанне прымусовай працы ў вытворчым ланцужку».

**Надзея ЮШКЕВІЧ.**

*yushkevich@zviazda.by*

# ПРАМЫ ДЫЯЛОГ

## Улада працягвае адказваць на пытанні жыхароў краіны

У гэтую суботу, **9 красавіка**, прамыя тэлефонныя лініі з насельніцтвам традыцыйна пройдуць ва ўсіх рэгіёнах Беларусі. Такія зносіны доўжацца ўжо больш за год, чыноўнікі гатовы хутка і кампетэнтна адказаць на пытанні беларусаў і вырашыць праблемы, з якімі не атрымоўваецца разабрацца самастойна.

**З 9.00 да 12.00 на званкі адкажуць:**

**Брэсцкі аблвыканкам**
намеснік старшыні САКОЎСКІ Віктар Яўгенавіч (80162213121);

**Віцебскі аблвыканкам**
кіраўнік справамі СЫСОЕЎ Аляксандр Уладзіміравіч (80212222222);

**Гомельскі аблвыканкам**
першы намеснік старшыні МІКАЛУЦКІ Аляксандр Віктаравіч (80232751237);

**Гродзенскі аблвыканкам**
намеснік старшыні ШУЛЕЙКА Юрый Вітольдавіч (80152735644);

**Магілёўскі аблвыканкам**
намеснік старшыні МАЛАШКА Валерый Анатолевіч (80222501869)

**Мінскі аблвыканкам**
намеснік старшыні ПЛАЎСКІ Алег Альфрэдавіч (80175004160);

**Мінскі гарвыканкам**
намеснік старшыні ДАМАРАЦКІ Андрэй Уладзіміравіч (80172224444).

**Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказвае глыбокія спачуванні намесніку старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па эканоміцы, бюджэце і фінансах, першаму намесніку генеральнага дырэктара — дырэктару па эканоміцы і фінансах адкрытага акцыянернага таварыства «Мінскі механічны завод імя С.І. Вавілава — кіруючая кампанія холдынгу «БелОМА» Марозу Аляксандру Іванавічу ў сувязі з напаткаўшым яго горам — смерцю МАЦІ.**

■ Тры пытанні да ўлады

# НА ПАРАДКУ ДНЯ — ЗАНЯТАСЦЬ НАСЕЛЬНІЦТВА

**Мікалай ШУМ узначаліў Маларыцкі райвыканкам у снежні мінулага года. У пачатку красавіка якраз мінулі знакамітыя сто дзён, але ж кіраўнік раёна — не тая пасада, каб было шмат часу на вывучэнне, высновы і назіранні. Усё гэта даводзіцца рабіць у працэсе работы. А можа і правільна? Менавіта ў стасунках з людзьмі магчыма найлепш убачыць праблемы ды намецiць падыходы да іх вырашэння. У сакавіку Мікалай Мікалаевіч правёў сустрэчу з калектывам сельгаспрадпрыемства «Дарапеевічы». Яшчэ раней старшыня праводзіў і прыёмы грамадзян, і «прамыя лініі». Адсюль і першае пытанне:**



***— З чым цяпер найчасцей звяртаюцца людзі ў райвыканкам, якія просьбы і праблемы агучваюць на прыёмах і ў пісьмах?***

— Апошнім часам значна абвастрылася праблема занятасці. На нядаўнім асабістым прыёме было некалькі просьбаў дапамагчы з працаўладкаваннем. За два-тры месяцы ў пошуках работы ў раённую службу занятасці звярнулася 123 чалавекі. Людзі ў асноўным застаюцца без работы ў выніку скарачэнняў. Так, напрыклад, наша знакамітае прадпрыемства «КварцМелПрам» праводзіла аптымізацыю: 16 чалавек трапілі пад скарачэнне. Многія жыхары горада і раёна, што працавалі ў Брэсце, пазбавіліся працоўнага месца ў выніку аптымізацыі на прыватных прадпрыемствах. У іх ліку 8 былых работнікаў «Санта Брэмар», 9 работніц прыватных швейных прадпрыемстваў, на іншых прыватных фірмах скарацілі яшчэ 19 жыхароў Маларыцкага раёна, сямёра раней працавалі на аб'ектах «Палессежылбуда»... Вось так і складваецца названая лічба.

Што можна прапанаваць людзям узамен? Да Вялікадня ў райцэнтры павінна адкрыцца гандлёвае прадпрыемства «Санта». Там створана каля 40 працоўных месцаў. Яшчэ восем чалавек будуць занятыя на прыватным гандлёвым аб'екце «Міла», які запланавана адкрыць у маі.

Вельмі асцярожна праяўляюць ініцыятыву гараджане і жыхары раёна ў справе адкрыцця ўласнай справы. З апошніх прыкладаў можна згадаць толькі новую вытворчасць паліўных пелет у памяшканні райаграсэрвісу, якое ўзяў у арэнду брастаўчанін. Цяпер там ідзе наладка абсталявання. З уводам у строй работу атрымаюць прыкладна паўтара дзясятка чалавек. Падобныя вытворчасці найбольш перспектыўныя. Таму зноў праводзім аналіз колькасці і якасці свабодных памяшканняў, каб прадаваць іх на аўкцыёне ці іншым спосабам і заахвочваць прадпрымальнікаў да новай справы.

***— Ведаю, што раней Маларыцкі раён актыўна супрацоўнічаў з украінскімі суседзямі. Цяпер шмат што мяняецца, як мы ведаем, праводзіцца дэмаркацыя мяжы. А як справа з суседскімі стасункамі?***

— Сапраўды, за апошнія два гады, як расказалі мне калегі, ранейшыя супрацоўніцтва, культурныя сувязі сталі амаль што згасаць. Але літаральна нядаўна нас наведалі дэлегацыі двух памежных суседніх раёнаў з настойлівай прапановай аднавіць былыя традыцыі. Нягледзячы на ўсе складанасці, якія перажывае Украіна, рэгіёны клапоцяцца пра сваю эканоміку, пра паляпшэнне жыцця. Іх прапанова наконт сумеснай работы ў рамках трансгранічнага супрацоўніцтва па паляпшэнні экалогіі, добраўпарадкаванні тэрыторый знайшла ў нас паразуменне. Славутыя Шацкія азёры знаходзяцца зусім побач, многія нашы людзі ездзяць туды адпачываць. Таму мы гатовыя разглядаць сумесныя праекты па тэме экалогіі. Гэта выгадна як нам, так і суседзям. Тым больш што мы жывём побач спакон веку, грамадзяне нашых краін маюць сваякоў па абодва бакі мяжы, сем'і перамяшаныя. Гэта варта ўлічваць і ў плане аднаўлення культурных сувязяў. Пра ранейшыя сумесныя канцэрты, святы, фестывалі нават ад вясковых людзей паспеў ужо пачуць.

***— Параўнальна нядаўна вы прыехалі з вёскі Дарапеевічы, сустракаліся з працоўным калектывам сельгаспрадпрыемства. Якія пытанні задавалі людзі, які ў іх настрой на працу і жыццё?***

— Пытанні задавалі жыццёвыя, звязаныя са штодзённым побытам. Там сёння ідзе будаўніцтва дарогі, дык пыталіся, ці можна паскорыць работу, прасілі крыху памяняць графік рэйсавага аўтобуса, выказвалі думкі па пенсійнай рэформе. Уражанні ад сустрэчы і клімату ў калектыве ў мяне найлепшыя, бо СВК "Дарапеевічы" эканамічна моцнае прадпрыемства, якое ўстойліва развіваецца. А калі казаць працэй... Ва ўсіх летась была засуха, палеткі цярпелі ад спёкі. У многіх кармы скончыліся, а ў Дарапеевічах і сабе хапае, і суседзям дапамагаюць. І калі ў сярэднім па раёне арганіку ўнеслі пад палову плошчаў яравой сяўбы, у Дарапеевічах гэту работу закончылі. Тут умеюць цаніць кожны спрыяльны для сельгасработ дзень на карысць захавання тэхналогіі. Адсюль — паказчыкі, зарплата. Так і людзі настроены, што галоўная задача цяпер як след правесці вясновыя работы. І яшчэ адно назіранне, звязанае з адносінамі да чалавека ў названай гаспадарцы. Мне расказалі, што СВК нават сваім ветэранам працы газеты выпісвае. І гэта не дробязь, а маленькія і важныя знакі ўвагі да людзей.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.** *yackevich@zviazda.by* ■

■ Адукацыя

# КРОПКІ ДЛЯ РОСТУ

## У цэнтры ўвагі — кваліфікацыя педагогаў

**Урад зацвердзіў дзяржаўную праграму «Адукацыя і маладзёжная палітыка» на 2016—2020 гады. Праграма ўключае адзінаццаць падпраграм, якія ахопліваюць усе ступені адукацыі, развіццё сістэмы паслянiверсітэцкай адукацыі, сістэмы дадатковай адукацыі дарослых, дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі, маладзёжную палітыку і г.д.**

Рэалізацыя падпраграмы «Развіццё сістэмы дашкольнай адукацыі» дазволіць да 2020 года павысіць ахоп дзяцей ад 3 да 6 гадоў установамі дашкольнай адукацыі да 98% (у 2015-м годзе гэты паказчык складаў 94,7%), у тым ліку ў сельскай мясцовасці да 70% (у 2015 годзе — 66,2%). Будзе ўдасканалена навукова-метадычнае і матэрыяльна-тэхнічнае забеспячэнне дашкольнай адукацыі, да 80% павысіцца аснашчанасць устаноў дашкольнай адукацыі аўтаматызаванай сістэмай па ўліку і кантролю за якасцю харчавання і інш.

У ліку асноўных задач падпраграмы «Развіццё сістэмы агульнай сярэдняй адукацыі» — павышэнне кваліфікацыйнага ўзроўню настаўнікаў, падрыхтоўка і выданне новых падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў, выкарыстанне ў адукацыйным працэсе сучасных сродкаў навучання і навучальнага абсталявання, удасканаленне нацыянальнай сістэмы ацэнкі якасці агульнай сярэдняй адукацыі.

Падпраграма «Развіццё сістэмы вышэйшай адукацыі» прадугледжвае павышэнне якасці вышэйшай адукацыі і паляпшэнне іміджу беларускай вышэйшай школы ў сусветнай адукацыйнай прасторы. Сярод асноўных задач — павышэнне кваліфікацыі прафесарска-выкладчыцкага складу, паглыбленне сувязяў вышэйшай школы з арганізацыямі — заказчыкамі кадраў, адкрыццё філіялаў кафедраў на прадпрыемствах, а таксама ў арганізацыях Нацыянальнай акадэміі навук. У адну з падпраграм уключаны мерапрыемствы па развіцці ў Беларусі сістэмы падрыхтоўкі кадраў для ядзернай энергетыкі.

Адказным заказчыкам дзяржпраграмы «Адукацыя і маладзёжная палітыка» выступае Міністэрства адукацыі. Фінансаванне праграмы будзе ажыццяўляцца ў межах сродкаў, якія прадугледжваюцца ў рэспубліканскім і мясцовых бюджэтах на гэтыя мэты, і з іншых крыніц.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by* ■

# ПРЫПЯЧЭ ПА-МАЙСКУ

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)**

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных спецыялістаў, на пачатку наступнага тыдня на тэрыторыю краіны пачне паступаць умерана цёплае паветра з боку Заходняй Еўропы. Тэмпературны фон крыху панізіцца. У панядзелак і аўторак удзень на большай частцы тэрыторыі пройдуць кароткачасовыя дажджы. У асобных раёнах — навальніцы. Уначы чакаецца плюс 5-12 градусаў, удзень — плюс 10-17 градусаў, а па ўсходзе — 21 цяпла.

## У КРАСАВІКУ — ЯШЧЭ ПЛЮС АДЗІН

Начальнік аддзела метэаралагічных прагнозаў Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды Аляксандр Бяганскі паведамляе, што сярэдняя тэмпература ў красавіку будзе перавышаць кліматычную норму, якая складае 4-7 цяпла, на адзін градус. Колькасць ападкаў прагназуецца ў межах нормы — ад 40 мм да 51 мм.

А яшчэ сіноптык паведаміў, што 6 красавіка ў Беларусі быў зафіксаваны шэраг тэмпературных рэкордаў дня. У прыватнасці, у сталіцы ў гэты дзень было 21,4 цяпла, а папярэдні максімум 6 красавіка тут быў зафіксаваны ў 1946 годзе — плюс 20,6. Яшчэ цяплейшы рэкорд быў зафіксаваны на метэастанцыі «Палеская» ў Брэсцкай вобласці, дзе тэмпература паветра паднялася да плюс 26,2 градуса. Таксама тэмпературныя рэкорды дня абнавіліся ў Пінску — плюс 25,9 градуса (супраць 22 цяпла ў 1946-м) і Жыткавічах — 25,8 цяпла (супраць плюс 23 градусаў у тым жа 1946-м).

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

## БЕСПІЛОТНІК НА ДАРОЗЕ

**Адным з першых рэзідэнтаў свабоднай эканамічнай зоны «Брэст» — кампаніяй «СТіМ» створана новая машына для дарожнай разметкі — робат з лазернай сістэмай. Як сцвярджаюць распрацоўшчыкі, аналагаў такога беспілотніка пакуль няма ў свеце. Машына атрымлівае заданне з дапамогай сістэмы GPS і наносіць на дарогу патрэбныя знакі.**

Зараз на прадпрыемстве праходзіць апрабаванне вопытны ўзор, якім ужо зацікавіліся патэнцыйныя пакупнікі з Расіі і Еўропы. Варта сказаць, што за 17 гадоў работы кампанія «СТіМ» стала лідарам сярод пастаўшчыкоў матэрыялаў і тэхнікі для дарожнай разметкі ў адпаведных арганізацыі Беларусі і Расіі. Брэсцкую гандлёвую марку таксама ведаюць дарожнікі Польшчы, Балгарыі, Іспаніі, Амерыкі, Ірана, Сірыі, Марока. Цяпер у асартыменце створанага менш за два дзесяцігоддзі таму з нуля прадпрыемства налічваецца больш за 30 адзінак тэхнікі і ўвесь комплекс матэрыялаў для разметкі.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.** *yackevich@zviazda.by*

## МЁДУ — ПОЎНЫЯ СОТЫ

**За апошнія пяць гадоў вытворчасць таварнага мёду ў лясгасах павялічылася на 192 працэнты, паведамілі ў прэс-службе Міністэрства лясной гаспадаркі.**

Так, калі ў 2011 годзе было атрымана 61,3 тоны гэтага карыснага прадукту, дык летась — ужо 117,9 тоны. Сёння ў галіне маецца больш за 8,2 тысячы пчаласем'яў, у тым ліку ў Брэсцкай вобласці амаль 2,3 тысячы, у Віцебскай — больш за 1,2 тысячы, у Гомельскай — 781, у Гродзенскай — 854, у Мінскай — амаль 2,4 тысячы, у Магілёўскай вобласці — 729 пчаласем'яў. У пяці лясгасах арганізаваны 32 буйныя пчальнікі, дзе маецца сто і больш пчаласем'яў. Размешчаны яны ў Смаргонскім доследным, Палескім, Жлобінскім, Камарынскім і Хойніцкім лясгасах.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

## ПАСЛУГІ СУВЯЗІ КРЫХУ ПАДАРАЖЭЛІ

**У Беларусі павялічваюцца тарыфы на паслугі электрасувязі агульнага карыстання для фізічных асоб. Такое рашэнне змяшчаецца ў пастанове Міністэрства эканомікі ад 31 сакавіка 2016 года №15, апублікаваным на Нацыянальным прававым інтэрнэт-партале.**

Для насельніцтва месячная абаненцкая плата за ўключаны ў асобную абаненцкую лінію тэлефон, пераведзены на пачасовую сістэму разлікаў за размовы, павялічыцца да 28,1 тысячы рублёў (у снежні мінулага года абанплата была ўстаноўлена ў памеры 27 тысяч рублёў). За кожную поўную або няпоўную хвіліну злучэння грамадзянам трэба будзе заплаціць 59 рублёў (у снежні — 57 рублёў). Поўная або няпоўная хвіліна размоў па міжгорадзе без дапамогі тэлефаніста абыдзецца карыстальнікам у 135 рублёў (у снежні — 130 рублёў).

Мабільны аператар Velcom з 4 красавіка павысіў кошт некаторых паслуг на тарыфных планах перадачы даных, тарыфных планах для юрыдычных асоб, паслуг роўмінгу, а таксама спецыяльных паслуг, якія аказваюцца ў партнёрстве з іншымі арганізацыямі. Пры гэтым зміненні не закрануць галасавыя тарыфныя планы для фізічных асоб. З улікам змянення рост сярэдняга абаненцкага рахунку ў сегментах, якія закране павышэнне, складзе каля 7%.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

## ДАВЯРАЙ, ДЫ ПРАВЯРАЙ

**На 2 млрд рублёў абакрала свайго наймальніка галоўны бухгалтар прыватнага прадпрыемства.**

Па словах пракурора аддзела па нагляду за дазнаннем пракуратуры Мінскай вобласці Кірыла Бубнова, жанчына мела права электроннага подпісу плацежных даручэнняў, на працягу двух гадоў неадназова пералічвала грошы з рахункаў арганізацыі на свае асабістыя карт-рахункі за фіктыўна аказаныя паслугі. Цікава, што факты крадзяжу выявіў сам дырэктар. Аднак жанчына абыхала вярнуць скрадзенае. Кіраўнік паверыў і не стаў разрываць з ёй працоўныя адносіны. У далейшым ён асабіста кантраляваў усе аперацыі. Ды нахабніца працягвала друкаваць у плацежных дакументах рэквізіты для пераліку грашовых сродкаў нібыта ў рэспубліканскі бюджэт у выглядзе падаткаў. Аднак наўмысна ўказвала нумар банкаўскага рахунка камерцыйнай фірмы, дзе таксама працавала бухгалтарам.

Як заявіла зламысніца, на такі ўчынак яе падштурхнула цяжкае матэрыяльнае становішча, а таксама жаданне прафінансаваць выдаткі салона прыгажосці, які ёй належыць.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.** *lazovskaya@zviazda.by*

## АБЧЫСЦІЎ СЕЙФ СВАЁЙ КАМПАНІІ

**Сталічныя праваахоўнікі ўстанавілі асобу і затрымалі маладога чалавека, які скраў з сейфа адной з мінскіх кампаній 40 мільёнаў рублёў.**

Супрацоўніца, якая адказвала за іх захаванасць, у адзін з дзён выяўшыла пералічыць гатоўку і падчас гэтага працэсу выявіла недастачу значнай сумы, паведамілі ў Цэнтральным РУУС. Было ўстаноўлена, што крадзеж грошай з сейфа ўчыніў адзін з супрацоўнікаў кампаніі, які адказваў за міжнародныя сувязі. Малады чалавек скарыстаўся адсутнасцю калег, адамкнуў сейф і забраў грошы. Зладзюжка, што цікава, раней не судзімы, мае станоўчыя характарыстыкі. Скрадзеныя сродкі ён патраціў на асабістыя патрэбы, у тым ліку заплаціўшы за крэдыт. Заведзена крымінальная справа.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

# ШЛЯХ У ВІРТУАЛЬНЫ СВЕТ?

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Шэраг кампаній знаходзіцца ў актыўнай стадыі працы над платформамі, якія дазваляюць атрымаць досвед знаходжання ў віртуальным свеце. Напрыклад, тайваньскі вытворца тэлефонаў HTC распрацаваў платформу Vive. Гэта ж дазволяць зрабіць і акуляры Oculus rift кампаніі Ocolus, якую нядаўна набыла Facebook. Заснавальнік апошняй Марк Цукерберг пры гэтым абвясціў, што бачыць у Oculus Rift і прыладах VR аснову для новага пакалення камп'ютарных тэхналогій, якое ідзе на змену смартфонам. Не варта выпускаць з-пад увагі і нядаўна анансаваныя акуляры віртуальнай рэальнасці ад Sony. Калі на рынку ўзнікае ўсё больш кампаній, здольных даць новы прадукт, то гэта можа азначаць толькі адно — у звычайных карыстальнікаў з'явіцца магчымасць выкарыстоўваць акуляры віртуальнай рэальнасці ўжо сёлета. Акрамя ўсяго іншага, у хуткім часе распрацоўшчыкі павінны знайсці цікавыя для шырокай публікі спосабы ўжывання віртуальнай рэальнасці. Многія кампаніі ўжо падрыхтаваліся да барацьбы за новы сектар, які абяцае сур'ёзныя прыбыткі. Рыначныя аналітыкі сцвярджаюць, што да канца гэтага года будзе прададзена 13 мільёнаў гарнітур віртуальнай рэальнасці, а да 2020 года іх колькасць вырасце да 97 мільёнаў.

## САЦЫЯЛЬНАЯ СЕТКА ІНШАЙ РЭАЛЬНАСЦІ

Падчас прэзентацыі сваіх новых мабільных прылад на Сусветным мабільным кангрэсе 2016 года, прадстаўнікі кампаніі Samsung запрасілі на сцэну **заснавальніка Facebook Марка ЦУКЕРБЕРГА**. Гэта сведчыць пра тое, што кампаніі прадоўжаць сумесную працу па развіццю прылад віртуальнай рэальнасці. Падчас прэзентацыі Марк Цукерберг расказаў, што бачыць будучыню сацыяльных сетак шмат у чым звязанай з тэхналогіямі VR, і яго кампанія збіраецца выкарыстоўваць напрацоўкі Samsung у гэтай вобласці для развіцця так званага відэа круговой панарамы, ці відэа-360. На яго думку, панарамныя відэа дазваляюць палепшыць успрыманне: карыстальнік зможа не проста глядзець на малюнак, а цалкам перанесціся ў іншы свет, як быццам ён серфер на Таіці або падарожнік па паверхні Марса.

У найбліжэйшы час нямала кампаній прапануюць пакупнікам камеры кругавой панарамы для стварэння відэа-360 пад праграмы і прылады VR. Таксама плануецца наладзіць і смартфоны, каб яны мелі магчымасць працаваць з прыладамі спрошчанага стварэння і прайгравання відэа кругавой панарамы і віртуальнай рэальнасці.




Гаворачы аб цэнах, варта пачаць з самых танных на сёння прылад Sony, якія гэтая кампанія анансавала на канферэнцыі распрацоўшчыкаў гульняў 2016 (GDC), што праходзіла з 14 па 16 сакавіка ў Сан-Францыска. Свой шлем віртуальнай рэальнасці PlayStation VR яны плануюць прадаваць за 400 долараў. У продажы ён з'явіцца ўжо ў кастрычніку гэтага года. За прыладу Oculus Rift неабходна будзе заплаціць па 200 долараў больш, а HTC Vive ацэньваецца на пачатковым этапе ў 800 долараў. У прылад будзе кінематаграфічны рэжым, які будзе адлюстроўваць віртуальны кінатэатр прама ў вашы вочы. Такім чынам, можна будзе глядзець фільмы і праходзіць гульні.

## ГЛЯДЗЕЦЬ ВІДЭА... ЗНУТРЫ

У пачатку 2015 года кампанія Google запусціла на YouTube новую магчымасць — праглядаць відэа-ролікі з прастораў агляду ў 360 градусаў. Гэта так званае панарамнае відэа — крок у бок віртуальнай рэальнасці. **Эксперт па брэндах кампаніі Google/Youtube Даніэль ПЯТРОЎСКІ** *(на фота)* падчас прэзентацыі ў Мінску ў рамках канферэнцыі «Дзелавы інтэрнэт» расказаў пра тое, што панарамнае відэа сёння з'яўляецца ключавым трэндам развіцця вэб-відэа. Глядач, такім чынам, ужо сёння здольны паглыбіцца ў падзею. Каб змяняць пункт агляду на камп'ютары, можна выкарыстоўваць мыш. Таксама можна ўжываць і некаторыя смартфоны. Каб перамяшчаць прастору агляду ў роліку на Youtube, дастаткова павярочваць гаджэт так, нібы вы трымаеце камеру і самі здымаеце відэа. На больш ранніх «слабых» прыладах перамяшчаць ракурс можна толькі пальцам, праводзячы ім па экране. З развіццём шлемаў VR з'явіцца магчымасць «залезці ўсярэдзіну відэа», дзе ракурс будзе мяняцца ўжо паваротам галавы. А гэта перспектыва ўжо найбліжэйшай будучыні.

Паводле інфармацыі ў блогу YouTube, каб здымаць панарамныя відэа, патрэбна камера, якая падтрымлівае гэты фармат. Сёння на рынку ўжо ёсць даступныя прыборы: 360cam ад Giroptic, SP360 ад Kodak, Allie ад IC Real Tech і Theta ад Ricoh. Тым не менш прылады далёка не танныя, і яны з'яўляюцца толькі першым пакаленнем такога віду дэвайсаў. У будучыні Google абяцае максімальна спрасціць і аўтаматызаваць працэс выкарыстання панарамных відэа. Пэўна, што ў будучыні і сам фармат падачы навін будзе развівацца ў гэтым кірунку. Глядач, такім чынам, становіцца відавочцам падзеі, якая будзе адбывацца ўжо не ў плоскасці экрана, а вакол чалавека.

## НОВАЯ ЗАЛЕЖНАСЦЬ?

З дапамогай віртуальнай рэальнасці ўжо сёння лечаць псіхічныя расстройствы. У Бельгійскім медыцынскім цэнтры горада Шарлеруа спецыялісты выкарыстоўваюць «віртуальны шлем» для таго, каб даць магчымасць пацыентам адчуць упэўненасць у самых небяспечных сітуацыях. Гэта зводзіць да мінімуму фобіі. Чалавек, які надзявае шлем віртуальнай рэальнасці, ведае, што на самой справе ён у бяспецы, але мозг рэагуе на малюнак перад вачыма, нібы дзеянне сапраўды адбываецца з ім.

Спачатку гэтая методыка ўжывалася для лячэння хвараючай прыхільнасці да відэагульняў. Цяпер віртуальныя дэкарацыі выкарыстоўваюць для лячэння акрафобіі і посттраўматычных стрэсаў. Паколькі існуе шмат розных фобій, то ў ідэале методыку неабходна падладжваць пад кожнага пацыента. Для развіцця гэтай тэхналогіі швейцарскія спецыялісты з політэхнічнай школы Лазаны працуюць над стварэннем цэлай віртуальнай кабіны.

Спецыялісты адзначаюць, што методыка лячэння з дапамогай віртуальнай рэальнасці ўжо даказала сваю эфектыўнасць. Аднак сёлета шлем VR стане даступным масаваму спажыўцу, а гэта азначае, што яго будуць выкарыстоўваць без нагляду спецыялістаў. Многія маладыя людзі, у асноўным тыя, хто не дасягнуў паўналецця, пакутуюць ад залежнасці, звязанай з камп'ютарнымі гульнямі. Гэта пры тым, што ў такія гульні сёння гуляюць на плоскім экране і яны толькі ствараюць невялікі эфект прысутнасці гульца ў віртуальным свеце. Што ж адбудзецца, калі гулец зможа сапраўды перанесціся ў віртуальную рэальнасць? У гульні ўсе пажаданні рэалізуюцца за мінімальны прамежак часу. Чалавек можа быць кім заўгодна і колькі заўгодна. Рэальнасць можа ў гэтым выпадку аддаліцца яшчэ далей. Ці не прывядзе гэта яшчэ да большай залежнасці ад камп'ютарных гульняў? На гэтае пытанне мы атрымаем адказы ўжо вельмі хутка.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.**
*kryzhevich@zviazda.by*

ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

# СТАЎКУ КРЫХУ ПАВЯЛІЧЫЛІ

**З першых дзён красавіка ў краіне павялічана тарыфная стаўка першага разраду для аплаты працы работнікаў бюджэтных арганізацый і іншых арганізацый, якія атрымліваюць субсідыі. Цяпер яна складае 298 тысяч рублёў. Аб гэтым гаворыцца ў пастанове Савета Міністраў ад 6 красавіка 2016 года №289.**

Згодна з гэтым дакументам, рэспубліканскім органам дзяржаўнага кіравання, мясцовым выканаўчым і распарадчым органам, кіраўнікам бюджэтных арганізацый неабходна забяспечыць пераразлік заработнай платы работнікаў у адпаведнасці з устаноўленай тарыфнай стаўкай першага разраду і каэфіцыентамі Адзінай тарыфнай сеткі работнікаў з улікам карэктуючых каэфіцыентаў.

# ЗОЛАТАВАЛЮТНЫЯ РЭЗЕРВЫ — 4 млрд 191,4 млн ДОЛАРАЎ

**Паводле інфармацыі прэс-службы Нацбанка, па выніках сакавіка золатавалютныя рэзервы Беларусі ў адпаведнасці з метадалогіяй Міжнароднага валютнага фонду павялічыліся на 80,4 млн долараў.**

У нацыянальным вызначэнні аб'ём золатавалютных рэзерваў вырас яшчэ мацней — на 131,2 млн долараў, і на 1 красавіка склаў 4 млрд 506,4 млн долараў у эквіваленце. Эксперты нашага фінансавага рэгулятара нагадваюць, што ў сакавіку ўрад і Нацыянальны банк Беларусі ў поўным аб'ёме пагасілі знешнія і ўнутраныя абавязацельствы ў замежнай валюце.

Падтрыманню золатавалютных рэзерваў спрыяла таксама паступленне першага траншу фінансавага крэдыту Еўразійскага фонду стабілізацыі і развіцця, сродкаў ад продажу Нацбанкам і Міністэрствам фінансаў аблігацый, намінаваных у замежнай валюце, купля галоўным банкам замежнай валюты на таргах таварыства «Беларуская валютна-фондавая біржа», а таксама паступленні ад збірання экспартных пошлін на нафту і нафтапрадукты.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

# А ТЫ ПАСАДЗІЎ СВАЁ ДРЭВА?

**Толькі за пяць дзён правядзення добраахвотнай акцыі «Тыдзень лесу — 2016» у ёй узялі ўдзел амаль 69 тысяч чалавек. Як і прагназавалася, сёлета яна стане самай масавай, з задавальненнем канстатуюць у Міністэрстве лясной гаспадаркі.**

Агульнымі намаганнямі за гэтыя дні па ўсёй краіне ўжо створаны лясныя пасадкі на плошчы 5 085 гектараў. Мерапрыемствы па добраўпарадкаванні праведзены на тэрыторыі 1 635 гектараў. На плошчы больш за 4 230 гектараў удзельнікі акцыі правялі работу па ачыстцы ляснога фонду ад смецця. Адрамантаваны 274 месцы адпачынку і пабудаваны 63 новыя.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*


## Закрытое акционерное общество «Белорусско-Швейцарский банк «БСБ Банк»

www.bsb.by

### БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 01 апреля 2016 г.

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | На 01.04.2016 г. | На 01.04.2015 г. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 5 |
| 1 | **АКТИВЫ** | | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | | 253 596 | 228 015 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | | 38 144 | 36 932 |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | | 121 592 | 189 964 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | | 656 514 | 381 867 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | | 310 605 | 206 615 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | | 43 886 | 73 398 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | | 7 273 | 5 184 |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | | 348 | 15 |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | | 284 560 | 318 791 |
| 11 | Имущество, предназначенное для продажи | 1110 | | - | - |
| 12 | Отложенные налоговые активы | 1111 | | 87 | 1 524 |
| 13 | Прочие активы | 1112 | | 87 868 | 55 785 |
| 14 | ИТОГО активы | 11 | | 1 804 473 | 1 498 090 |
| 15 | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | | |
| 16 | Средства Национального банка | 1201 | | 9 778 | 32 754 |
| 17 | Средства банков | 1202 | | 524 | 3 477 |
| 18 | Средства клиентов | 1203 | | 1 252 112 | 996 652 |
| 19 | Ценные бумаги, выпущенные банком | 1204 | | - | - |
| 20 | Производные финансовые обязательства | 1205 | | 29 890 | 14 133 |
| 21 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | | - | - |
| 22 | Прочие обязательства | 1207 | | 27 600 | 12 423 |
| 23 | ВСЕГО обязательства | 120 | | 1 319 904 | 1 059 439 |
| 24 | **СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | | |
| 25 | Уставный фонд | 1211 | | 229 000 | 201 000 |
| 26 | Эмиссионный доход | 1212 | | - | - |
| 27 | Резервный фонд | 1213 | | 34 503 | 28 440 |
| 28 | Фонды переоценки статей баланса | 1214 | | 154 070 | 187 568 |
| 29 | Накопленная прибыль | 1215 | | 66 996 | 21 643 |
| 30 | ВСЕГО собственный капитал | 121 | | 484 569 | 438 651 |
| 31 | ИТОГО обязательства и собственный капитал | 12 | | 1 804 473 | 1 498 090 |

### ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ на 01 апреля 2016 г.

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | На 01.04.2016 г. | На 01.04.2015 г. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | | 11 977 | 22 283 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | | 6 461 | 7 144 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | | 5 516 | 15 139 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | | 44 527 | 46 995 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | | 8 121 | 5 343 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | | 36 406 | 41 652 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | | 10 591 | 7 138 |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | | 2 321 | 831 |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | | 48 718 | 46 451 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | | (13 346) | (5 522) |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | | 24 914 | 50 269 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | | 3 727 | 2 675 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | | 50 597 | 44 603 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | | 1 684 | 1 191 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | | 16 738 | 12 301 |
| 16 | Расход (доход) по налогу на прибыль | 212 | | 2 000 | - |
| 17 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | | 14 738 | 12 301 |
| 18 | Сведения о прибыли на одну акцию в белорусских рублях | | | | |
| 19 | Базовая прибыль на простую акцию | 22 | | 1 | 1 |
| 20 | Разводненная прибыль на простую акцию | 23 | | 1 | 1 |

**Руководитель** **Казбанов В.А.**

**Главный бухгалтер** **Авраменко Т.В.**

Лицензия на осуществление банковской деятельности, выданная Национальным банком Республики Беларусь № 7 от 27.09.2013. УНП 807000069.



***Уважаемые акционеры ОАО «Управление механизации № 88»***

**31 марта 2016 года было проведено общее собрание акционеров**

**ОАО «Управление механизации № 88»**

По итогам общего собрания акционеров было принято решение о реорганизации Общества, поскольку данное решение влечет за собой возникновение у акционеров Общества права требования выкупа акций Общества, ОАО «Управление механизации № 88» уведомляет акционеров Общества о том, что в срок до 20 мая 2016 года акционеры могут предъявить Обществу письменное требование о выкупе принадлежащих им акций.

Письменное требование акционера о выкупе принадлежащих ему акций должно быть направлено в адрес ОАО «Управление механизации № 88»: 220075, Республика Беларусь, г. Минск, улица Промышленная, 23, 3-й этаж. Также требование должно содержать фамилию, имя и отчество (наименование) и подпись акционера, количество акций, выкупа которых он требует.

Выкупная цена одной акции утверждена на общем собрании акционеров в размере ее номинальной стоимости и составляет 299 (Двести девяносто девять) белорусских рублей.

УНП 100097541

## Алена БІКРАНЁВА:

# «ЧАРАЎНІЦТВА ТОІЦЦА Ў ДАБРЫНІ І ЛЮБОВІ»

**Яна з дзяцінства любіла казкі. Але, мабыць, нават марачы пра акцёрскую прафесію, не ўяўляла, што стане самай сапраўднай Феяй Сноў. Менавіта яе выбралі ў свой час дзеці ў якасці вядучай для папулярнай праграмы «Калыханка», якая штовечар ідзе ў эфіры тэлеканала «Беларусь 3». На экране мы заўсёды бачым усмешлівую, мудрую чараўніцу. Але чым жыве фея па-за межамі здымачнай пляцоўкі? Пры сустрэчы актрыса Алена Бікранёва расказала пра свае прыярытэты ў жыцці, сямейныя традыцыі і чароўнае месца, дзе кожны можа вярнуцца ў дзяцінства...**



Дарыць гледачам чароўныя сны ў кампаніі Топы, Яначкі і Сплюшыка — сапраўднае задавальненне.

***— Як вы адчуваеце сябе ў ролі Феі Сноў?***

— Ролю вядучай на «Калыханцы» я выконваю ўжо дзесяць гадоў. І калі раней фея была ў казачных сукенках, з чароўнай палачкай, то ў новым сезоне мая гераіня выглядае больш сучасная. Нават на вуліцы мяне цяпер часцей пазнаюць. Могуць падысці і павітацца. А раней часта не маглі зразумець, як гэта фея купляе ў краме смятану альбо цукеркі. Здараліся розныя казусы. Чула, як дзіця пытала ў маці: «Няўжо феечка таксама салодкае любіць?» На што я адказвала, быццам купляю ўсё для мядзведзіка Топы і лісічкі Яны.

***— Ведаю, што вы трапілі на праграму пасля перамогі ў кастынгу...***

— Мяне запрасілі на пробы. Пра адбор я нават не ведала. Але калі мне патэлефанавалі, то аказалася, што мяне парэкамендавала мая выкладчыца з універсітэта. І я вельмі ўдзячная ёй, бо на той час мы ўжо даўно скончылі вучобу і было прыемна разумець, што пра мяне не забылі. Я тады рыхтавалася да вяселля, таму ўсе падзеі, якія адбываліся ў жыцці паралельна, успрымала спакойна. У тым ліку і не хвалявалася, ці выберуць мяне. Але ж аказалася, што пераможцу сярод усіх прэтэндэнтак на ролю вядучай вызначалі не дарослыя, а самі дзеткі. І за мяне аддала свае галасы большасць.

***— І ў дзень вяселля вам паведамілі гэтую прыемную навіну... Праца на «Калыханцы» змяніла вас, ваша ўспрыманне жыцця ў нечым?***

— Ведаеце, мне пашчасціла, бо мая выкладчыца, парэкамендаваўшы мяне, сказала: «Ёсць дзяўчына, якая падыходзіць для ролі». А калі я прыйшла працаваць на «Калыханку», то мяне часта запытвалі: ну як, цяжка? Трэба ж адпавядаць, трымаць сябе ў рамках? Мне ж гэтага не патрабавалася, бо я без шкодных звычак, займаюся спортам, і таму не трэба было ламаць і перастройваць сябе, свае звычкі, паводзіны за кадрам дзеля ролі. Я заўсёды любіла дзяцей, яшчэ з часоў, калі вяла дыскатэкі, дні нараджэння. І магчымасць працаваць для іх стала для мяне тым самым чараўніцтвам, якое мне падараваў лёс.

***— У чым для вас праяўляецца чараўніцтва ў паўсядзённым жыцці?***

— Для любой маці самае чароўнае — гэта нараджэнне дзетак. У мяне ёсць дзве дачкі — васьмігадовая Дзіяна і пяцігадовая Ганна. Таксама чараўніцтва тоіцца ў дабрыні і любові, якой мы дзелімся з іншымі людзьмі. Напрыклад, дапамагчы камусьці грашыма добра, аднак праявіць у адносінах да іншага цеплыню, душэўнасць нашмат важней. Проста сказаўшы чалавеку прыемныя словы, мы памнажаем чараўніцтва ў гэтым свеце. Сёння не хапае такой адкрытасці і еднасці. Мне пашчасціла, бо я маю цудоўную сям'ю, сяброў, вырасла і была выхавана ў іншы час. Таму і сёння той жа інтэрнэт не замяняе для мяне жывых зносін. Сумесны паход у кіно, на прагулку і многія іншыя рэчы здольны падмацоўваць нашы адносіны з людзьмі. Важна памятаць пра гэта ў наш век наяўнасці гаджэтаў, калі, бывае, напісаць прасцей, чым патэлефанаваць...

***— Ці знаходзіць водгук у вашым стылі выхавання дзяцей тое, як паводзілі бацькі сябе ў дачыненні да вас?***

— Адбітак заўсёды прысутнічае, бо карані ўсяго ідуць з сям'і. І калі сустракаюцца мужчына і жанчына з жаданнем стварыць сваю сям'ю, то іх уяўленні пра яе аб'ядноўваюцца ў адно цэлае. І толькі потым ужо нешта трансфармуецца. Хачу адзначыць, што вельмі многае тут залежыць менавіта ад жанчыны, якая стварае сямейны ачаг. Я, дзякаваць Богу, вырасла ў поўнай сям'і. Так, у параўнанні з цяперашнімі магчымасцямі і вандраваць, і набываць штосьці тады было складаней. Але ў маёй памяці захавалася столькі светлых успамінаў з дзяцінства, якія я імкнуся ўвасабляць у жыццё сваёй сям'і!.. Гэта і выезды ў лес, і начлегі ў палатках, і захаванне розных традыцый, якія я пераняла ад сваіх родных. Напрыклад, я вучуся многім рэчам у маёй бабулі Нілы, гэта маміна маці. Яна ў нас чалавек-батарэйка. Адпрацаваўшы шмат гадоў у сталеліцейным цэху, страціўшы мужа, нам бабуля паказвае прыклад жанчыны, якая любіць жыццё. Ходзіць на танцы, хораша прыбіраецца, заўсёды ўсміхаецца і пра ўзрост нават гаварыць не хоча. Ведаеце, я хачу сабе такой будучыні — каб сустрэць старасць у коле дзяцей, унукаў, праўнукаў.

***— Якія традыцыі ёсць у вашай сям'і?***

— Я вельмі люблю, калі мы ўсе збіраемся разам. Напрыклад, святкуючы дзень народзінаў, сустракаюцца і прабабулі, і праўнукі... Тады пануе сапраўдная атмасфера шчасця, свята. Вельмі чакаем зараз Вялікдзень. І мае дзяўчаты ведаюць, што найлепшыя пірагі яны хутка пакаштуюць у гасцях у бабулі і дзядулі. Гатуюць іх мае мама з татам у тандэме — яна змешвае інгрэдыенты, а ён вымешвае цеста, потым упрыгожваюць разам і выпякаюць. І, паспытаўшы такіх прысмакаў, ты адчуваеш, што рабілася гэта ўсё з душой. Таксама на свята асвячаем яйкі, кулічы, цукеркі. І вось такога кшталту звычаі, якія я пераняла з дзяцінства, вельмі цэняцца ў маёй сям'і.

***— А ў побыце вы часцей адчуваеце сябе феяй ці стомленай пчолкай?***

— Мая дачка часам з гонарам кажа, што яе маці — фея. Але ў штодзённых клопатах я адчуваю сябе па-рознаму. Як і многія звычайныя жанчыны, я паспяваю і працаваць, і знаходзіць час на дзяцей, мужа. І часам адчуваю сябе вельмі стомленай пчолкай. Аднак, калі муж ладзіць для мяне нейкія святы, сюрпрызы, то тады я самая сапраўдная прынцэса.

***— Што, на ваш погляд, самае важнае для жанчыны?***

— Для мяне, перш за ўсё, важна заставацца самой сабой. Прыкладна на аднолькавых пазіцыях у маім жыцці знаходзяцца жаданні займацца справай па душы і быць добрай маці, гаспадыняй. Скіроўваць усю сваю энергію і сілы толькі ў адно рэчышча для мяне недастаткова, хоць ведаю прыклады жанчын, якія шчаслівыя толькі ад таго, што займаюцца домам. Так, я не зарабляю шмат грошай і асноўныя клопаты па фінансавым забеспячэнні ляжаць на плячах майго мужа. Але Дзіма заўсёды казаў мне, каб я займалася тым, што робіць мяне шчаслівай, прыносіць задавальненне, бо тады любоў і цеплыня ў нашым доме будуць павялічвацца.

***— З нараджэннем дачок вы сталі іншай?***

— Я і сёння памятаю тыя моманты, як плакала ад шчасця, калі нарадзіліся мае дзеці. Для мяне было проста неверагодным усведамленне таго, што ў табе жыве і потым з'яўляецца на свет новае жыццё. І ты ўжо становішся больш асцярожнай. Часцей задумваешся, ці варта недзе рызыкаваць, бо трэба берагчы сябе дзеля іншых блізкіх табе людзей. Я стала лепш разумець сваю маму, якая часта паўтарала: не забудзь шапку, прыхапі з сабой бутэрброд. Стала больш удзячнай бацькам за іх любоў і клопат.

***— Такія моманты, як прагляд з дзецьмі тэлеперадач, чытанне ім казак перад сном, спяванне калыханак наколькі важныя для кожнага з нас?***

— Я сваім дзяўчатам чытаю розныя казкі, бывае. што мы разам нават прыдумляем свае гісторыі. Малодшая дачка любіць у такіх выпадках пытацца: «Мама, а што мы будзем сніць?» І тады ўжо пачынаю прыдумляць казкі пра аднарогаў, фей, матылькоў. Паверце, калі вы разам з дзіцем складаеце сваю гісторыю, то ўзнагародай будуць іх шчасце і захапленне! Таму чытаць, спяваць сынам і дочкам проста неабходна. Мне ў дзяцінстве бацькі таксама шмат казак апавядалі. І цяпер, калі мы збіраемся да бабы з дзедам з начлегам, то дочкі могуць патэлефанаваць ім і сказаць: «Мы сёння прыедзем, а ты, дзядуля, раскажаш нам пра дэльфінаў?» Вельмі ім падабаюцца розныя аповеды пра жывёл. Тады мой бацька заходзіць у інтэрнэт, шукае цікавыя факты і потым унучкам расказвае цікавую гісторыю.

***— А вы самі часта адчуваеце сябе дзіцем?***

— Дзякуючы маім бацьку і маці, маё жыццё доўгі час было расфарбавана ў ружовыя тоны. Я верыла ў Дзеда Мароза, у чараўніцтва... Можа, нехта і паспрачаецца са мной, аднак тое, што мяне аберагалі ад рознага негатыву ў дзяцінстве, дазволіла мне без страху ўвайсці ў дарослае жыццё. Але кожны раз, прыязджаючы ў бацькоўскі дом, я магу адчуць сябе дзіцем. Там зноў пражываеш імгненні цеплыні, клопату, якія табе дораць блізкія людзі. Усім жа нам часам хочацца апынуцца хоць на пяць хвілінак у тым часе, дзе ўсё было так бясклапотна і лёгка. Бо дзеці часам не разумеюць, як маме складана бывае, а мужчынам увогуле многія рэчы трэба тлумачыць, а не чакаць, пакуль муж сам здагадаецца... А бацькі заўсёды ведаюць, што табе патрэбна. З імі адчуваеш сябе абароненым ад розных жыццёвых нягод, іх безумоўная любоў саграває. Тады проста хочацца пабыць у гэтым моманце, атрымаць ад яго асалоду. Таму беражыце сваіх бацькоў. Пакуль яны з вамі, вы можаце вярнуцца ў дзяцінства ў любым узросце.



Алена з дочкамі Дзіянай і Ганнай і ў паўсядзённым жыцці адчувае сябе чараўніцай.

**Алена ДРАПКО.**

## Субота, 16 красавіка

### Беларусь 1

6.55 Існасць.
**7.20, 22.10 Меладрама «Даша». 1—2-я серыі.**
**9.00, 12.00, 15.00** Навіны.
**9.10 Серыял «Сваты». 1-я серыя.**
**10.30** «50 рэцэптаў першага».
**11.25** Дача.
**12.10** «Здароўе». Ток-шоу.
**13.05, 15.45 Меладрама «Сляпы разлік».**
**15.15** Краіна.
**17.30 Меладрама «Каханне без лішніх слоў».**
**21.00** Панарама.
**21.40** Пункт гледжання.
**1.30** Дзень спорту.

### Беларусь 2

**6.55 Серыял «Класная школа». 1-я серыя.**
**7.25, 21.05** Тэлебарометр.
**7.30 Серыял «Шчаслівыя разам».**
**9.25** «Занадта шмат хвастоў».
**10.00** Азбука густу.
**10.30 Серыял «Хто ў доме гаспадар?»**
**12.30** «Бітва экстрасэнсаў. Апакаліпсіс».
**14.55** Капейка ў капейку.
**15.30 Анімацыйны фільм «Рогі і капыты».**
**17.00 Трылер «Прарок».**
**18.45** «Чалавек-невідзімка». Рэаліці-шоу.
**19.50** «Здзіві мяне». Талент-шоу.
**21.10 Выбар гледачоў. Баявік «Прафесіянал».**
**22.00** Спортлато 6 з 49, КЕНО.
**23.20** Хачу ў тэлевізар!
**23.25** «Арол і рэшка. Шопінг». Трэвел-шоу.
**0.25 Серыял «Як я сустрэў вашу маму».**

### Беларусь 3

**8.00, 11.10, 18.25** «Калейдаскоп».
**8.15, 13.40** «Размаўляем па-беларуску». Тэлевіктарына.
**8.20 «Казус Кукоцкага». Драма. «Новая рэальнасць».**
**9.10** «Камертон». Джазавая спявачка, кампазітар Крысціна Станька (Польшча).
**9.40, 16.55 «Мы з Вамі недзе сустракаліся». Камедыя.**



**11.25** «Брэсцкая крэпасць». Дак. фільм.
**12.10 «Бессмяротны гарнізон». Драма.**
**14.10** «Час кіно».
**14.20 «Нізамі». Драма.**
**16.30** «Камертон». Ансамбль «Хаджасце» (Іран).
**18.40** Да 30-годдзя чарнобыльскай катастрофы. «Адраджэнне». Перадача 7-я «Культура памяці».
**19.10 «Казус Кукоцкага». Драма. «Дзяўчынкі выраслі».**
**20.00** Леанід Млечын прадстаўляе. «Сусветныя тайны». «Імператарскі цягнік. Ракавы маршрут». Дак. фільм.
**20.40** «Калыханка».
**21.00** «Андрэй Грамыка. Гігант, якому ўдалося выжыць». Дак. фільм.
**21.55** «Любімыя ВІА». Канцэрт з удзелам папулярных ВІА 70-х, 80-х гадоў.
**23.00** «Бард-парад».

### Беларусь 5

**7.30, 21.50** PRO спорт. Навіны.
**7.40** Бокс. Алімпійская кваліфікацыя. Паўфіналы.
**8.40** Свет англійскай прэм'ер-лігі.
**9.10** Піт-стоп.
**9.40** Хакей. КХЛ. Фінал. Пяты матч. ЦСКА (Масква) — «Металург» (Магнітагорск).
**11.40** Хакей. Чэмпіянат свету. Дывізіён I (U-18). Германія — Беларусь.
**13.30** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Відэачасопіс.
**14.00** Тэніс. Кубак Федэрацыі. Расія — Беларусь.
**18.00, 23.55** Бокс. Алімпійская кваліфікацыя. Фіналы.
**20.00** Футбол. Беларусбанк — чэмпіянат Беларусі. 3-ці тур. «Шахцёр» (Салігорск) — «Дынама» (Мінск).
**22.00** Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Чэлсі» — «Манчэстэр Сіці».

### АНТ

**7.00** «Суботняя раніца».
**8.00, 9.00, 16.00, 20.30** Нашы навіны.
**9.05** М/с «Смяшарыкі. Новыя прыгоды».
**9.25** «Здароўе».
**10.25** «Смак».
**11.00** «Ідэальны рамонт».
**12.00** «Разумніцы і разумнікі».
**12.45** «Адкрыццё Кітая».
**13.15** Да 75-годдзя акцёра. «Сяргей Ніканенка. «Мне засталася адна забава...».
**14.10 Серыял «Абдымаючы неба».**
**16.15, 21.00** Навіны спорту.
**16.20** «Тэорыя змовы».
**17.20** «Удача ў прыдачу! З «Еўраоптам».
**18.00** «Адгадай мелодыю».
**18.35 Мюзікл «За двума зайцамі».**
**21.05** «Сёння вечарам».
**22.25** «Падмаскоўныя вечары».
**23.20 Маст. фільм «Некіруемы».**

### СТБ

**6.30 «Студэнты». Серыял.**
**7.15** «Анфас».
**7.30 Камедыя «Рымскія канікулы».**
**9.30** «Часткі свету».
**10.00** «Разумней не прыдумаеш з Міхаілам Марфіным». «Чэмпіёнскі сезон».
**11.00** «Мінск і мінчане».
**11.35** «Дарагая перадача».
**11.45 «Салдаты 10». Серыял.**
**13.30, 16.30, 19.30** «24 гадзіны».
**13.40, 1.30 Меладрама «Вас чакае грамадзянка Ніканорава».**
**15.15** Канцэрт Міхаіла Задорнава.
**15.50** «Вялікі горад».
**16.40** «Наша справа».
**16.55** «Вадзіць па-руску».
**17.25 Маст. фільм «Не ўз'сабе».**
**20.00** «СТБ-спорт».
**20.10 Маст. фільм «Браты Грым».**
**22.15** «Самыя жудасныя эпідэміі».
**23.55 Маст. фільм «Мы — легенды».**

### МІР

**6.00, 8.00, 15.20** М/ф.
**7.30** «Саюзнікі».
**8.30** «Медыцынская праўда».
**9.00** «Вой, мамачкі!»
**9.30** «Няма праблем».
**10.00, 16.00** Навіны (бягучы радок).
**10.15** «Зроблена ў СССР».
**10.45, 23.25 Маст. фільм «Адзінокім даецца інтэрнат».**
**12.25** «Цяжар абеду».
**12.55, 2.05 Маст. фільм «Сэрцаедкі».**
**16.15 Серыял «Адчайныя хатнія гаспадыні».**
**21.10** «Трымайся, шоубіз!»
**21.40** Канцэрт «Аўтарадыё 20 гадоў. Найлепшае».
**1.05** «Дыяспары».
**1.35** «Чаму я?»
**4.20** М/ф «Маўглі».

### РТР—Беларусь

**7.00** «Пакой смеху».
**7.45 Маст. фільм «Мяцеліца».**
**11.00, 14.00** Весткі.
**11.15** «Правілы руху».
**12.05 Маст. фільм «Простая дзяўчына».**
**14.15** «Асабістае. Людміла Чурсіна».
**15.00** «Ха». Маленькія камедыі.
**15.35 Маст. фільм «Залатыя нябёсы».**
**17.20, 21.00 Маст. фільм «Навучаю ігры на гітары».**
**19.00** «Карціна свету».
**19.55** Надвор'е на тыдзень.
**20.00** Весткі ў суботу.
**22.30 Маст. фільм «Ненавіджу».**

### НТБ—Беларусь

**6.05** «Астрапрагноз».
**6.10, 8.20 Серыял «Сужэнцы».**
**8.00, 10.00, 16.00** Сёння.
**8.50** Кулінарны паядынак.
**9.25** «Урачэбныя тайны плюс».
**10.25** «Галоўная дарога».
**11.00** «Ежа жывая і мёртвая».
**12.00** «Кватэрнае пытанне».
**13.05** «Высоцкая Life».
**14.05** «Люстэрка для героя».
**15.05** «Наш космас».
**16.20 Дэтэктыў «Мент у законе».**
**18.05** «Следства вялі...»
**19.00** «Цэнтральнае тэлебачанне».
**19.55** «Новыя рускія сенсацыі».
**20.50** «Ты не паверыш!»
**21.40 Серыял «Марскія д'яблы. Смерч. Лёсы».**
**23.15 Серыял «Хмураў».**

### 8 канал

**9.00, 15.50, 19.05, 20.55, 23.55** «Надвор'е».
**9.05** М/ф.
**9.15 Серыял «Абараніць боса».**
**10.20, 10.45, 15.55, 18.55** «Хатняя крама».
**10.35** «Даведнік па краінах і кантынентах».
**11.00 Вестэрн «Цудоўная сямёрка».**
**13.10 Вестэрн «Вяртанне цудоўнай сямёркі».**
**14.50** «Мультпарад».
**16.00** «Адшукваецца адпачынак».
**16.30 Серыял «Лэдзі-дэтэктыў».**
**17.30 Прыгоды «Акула-прывід».**
**19.10 Фантастыка «Гравітацыя».**
**20.45** «Вечарніца».
**21.00** «Фэшн is my прафэшн».
**21.15 Драма «Галоўны канструктар».**
**23.15 Серыял «Штам».**

### ВТБ

**6.00, 9.30, 5.30** «Лаві момант».
**6.30** «Паспець за 24 гадзіны».
**7.30** М/ф «Ёка».
**7.45** М/ф «Смяшарыкі».
**8.00** М/ф «Маша і мядзведзь».
**8.30** «Ералаш».
**9.00, 4.30** Скетч-шоу «6 кадраў».
**10.00, 1.00** «Турбаміксер».
**12.00** «Хто каго на кухні».
**12.30** «Здаецца! З рамонтам».
**13.30** Фантастыка «Эан Флакс».



**15.30** «Уральскія пельмені».
**17.00** М/ф «Шрэк 3».
**18.30** «Два галасы».
**20.30** Фантастыка «Трансформеры».
**23.05, 4.00** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**23.30** «Дзікія гульні».
**0.30** Скетчкам «Студэнты».
**3.30** «Дурні і дарогі».

### Культура

**6.30** «Еўраньюс».
**10.00** «75 гадоў Сяргею Нікаленку. «Цалуюцца зоры». Маст. фільм.
**11.15** «Простыя няпросты Сяргей Нікаленка». Дак. фільм.
**12.00** «Кукрыніксы супраць Трэцяга рэйха». Дак. фільм.
**12.40** Пернікавы домік. «Гульня ў салдацікі».
**13.10** «На гэтым тыдні... 100 гадоў таму. Нефрантавыя нататкі».
**13.40** «Танцы народаў свету». Канцэрт Дзяржаўнага акадэмічнага ансамбля народнага танца Башкартастана імя Ф. Гаскарава.
**14.30** «Прынцэса цырка». Маст. фільм.
**17.00** Навіны культуры.
**17.30, 1.55** «Вепскі Запавет». Дак. фільм.
**18.20** «Эдуард Манэ». Дак. фільм.
**18.30** Да 60-годдзя тэатра «Сучаснік». Спектаклі-легенды. М. Няёлава, А. Пакроўская, Г. Пятрова, Л. Крылова, Л. Ахеджакава, М. Аляксандрава, Н. Дарошына, Г. Фралоў, М. Жыгалаў у спектаклі «Круты маршрут».
**20.50** «Марына Няёлава. Я заўсёды на сцэне». Дак. фільм.
**21.45** «Рамантыка раманса». Леаніду Дзербянёву прысвячаецца...
**22.50** «Белая студыя». Валянцін Гафт.
**23.30** Кіно на ўсе часы. «Артыст». Маст. фільм.
**1.15** Легенды свінга. Валерый Кісялёў і Ансамбль класічнага джаза.
**2.45** «Стэндаль». Дак. фільм.

### Настальгія

**6.00** «Яловая субмарына» з Аляксандрам Ліпніцкім: «Гісторыя рускага рока. Аляксей Хвасценка». 2006 год.
**7.00, 8.20, 9.40, 11.00, 12.25, 13.45, 15.40, 17.00, 17.40, 19.20, 20.20, 21.50, 23.30, 0.15, 2.05, 3.40, 5.00, 5.40** Музычная настальгія.
**7.15, 12.50** Маст. фільм «Прызнанне ў каханні».
**8.40** «Сакрэты прыроды». «Абарыгены Антарктыды». 1980 год.
**9.00, 15.00, 3.00** «Мінулы час».
**10.00, 4.00** «Народжаныя ў СССР».
**12.00** Дак. фільм «Вялікі містыфікатар».
**14.00** «Народжаныя ў СССР». Найлепшае. Ала Пугачова. 2014 год.
**16.00** «Колба часу».
**17.30, 5.30** «Сядзі і глядзі». Музычна-парадыйная праграма. 2005 год.
**18.00** «Зямля—Паветра». Група «Аквариум». 2003 год.
**19.45** Дак. фільм «Эканоміка ў пошуках ісціны».
**20.10** «Навіны дня. Хроніка нашых дзён». Людзі перабудовы. 1991 год.
**20.40** М/ф «Высокая горка».
**21.00** «Быў час». 2009 год.
**22.00** Маст. фільм «Маналог».
**0.00** Дак. фільм «Мітурычы».
**1.00** Маст. фільм «Белы танец».
**2.40** «Сакрэты прыроды». «Гняздо ў снезе». 1979 год.

### EuroSport 1

**4.00, 7.30, 15.00** Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат Еўропы. Жанчыны.
**5.00, 8.30, 11.00, 17.15, 0.05, 1.30** Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат Еўропы. Мужчыны.
**6.00, 9.30** Снукер. Чэмпіянат свету-2015. Фінал.
**14.00** Супербайк. Чэмпіянат свету.
**19.45** Снукер. Шоу Роні А'Саліван.
**20.15, 2.30** Снукер. Чэмпіянат свету.

### Камедыя

**0.30** Камедыя «Шалёныя грошы».
**2.15** Камедыя «Амаль замужам».
**3.55** Меладрама «Даю год».
**5.40** Камедыя «Кур'ер».
**7.25** Камедыя «Няголены нянь».
**9.00** Камедыя «Чалавек-эльф».
**10.35** Меладрама «Пастка для нявесты».
**12.10** Камедыя «Закаханая ведзьма».
**14.00** Камедыя «Няхай жыве Францыя!».
**15.45** Скетчкам «Паміж намі».
**16.00** Камедыя «Вяселле па абмене».
**17.45** Камедыя «Ёлкі 3».
**19.30** Камедыя «Кекс у вялікім горадзе».
**21.10** Камедыя «Тарыф Навагодні».
**22.45** Меладрама «Закахацца ў нявесту брата».

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**9.45** «Сардэчна запрашаем дадому!»
**10.35** «Хронікі маскоўскага побыту».
**11.30** «Доказ віны».
**12.20, 2.00** «Цудоўнае стагоддзе». Серыял.
**15.50** «Элвін і бурундукі». Камедыя.
**17.30** «10 самых».
**18.05, 5.10** «Трынаццаць знакаў Задыяка».
**19.10** «Дзяўчынка». Драма.
**21.40** «Экстрасэнсы супраць вучоных».
**22.35** «Небяспечныя пасажыры цягніка 123». Баявік.



**0.25** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.

### ТБ1000

**6.10, 18.15** Мюзікл «Бляск».
**8.10, 4.25** Камедыя «28 дзён».
**10.00, 2.10** Драма «Доўгія зімовыя».
**12.20** Драма «Куды прыводзяць мары».
**14.20** Драма «Гульня з агнём».
**16.10** Баявік «У промнях славы».
**20.10** Прыгоды «Джуманджы».
**22.10** Меладрама «Эрын Бровіч — прыгожая і рашучая».
**0.25** Меладрама «Жонка вандроўца ў часе».

### ТБ1000 Рускае кіно

**6.20** Баявік «Фарт».
**8.10, 2.10** Камедыя «Атамны Іван».
**10.20, 4.20** Драма «Я не вярнуся».
**12.30** Драма «Алеся».
**14.15** Драма «Карасі».
**16.25** Камедыя «8 першых спатканняў».
**18.15** Драма «Клінч».
**20.20** Камедыя «Смайлік».
**22.10** Драма «Час пік».
**0.20** Меладрама «Вораг нумар адзін».

### National Geographic

**6.00, 13.35, 5.35** Гульні розуму.
**6.50** Займальная навука.
**7.15** Папулярная навука.
**7.40, 17.50** Каралі шахт.
**8.20** Незвычайныя промыслы.
**9.10** Золата Юкана.
**10.00** Будаўнічая ліхаманка.
**10.45** Дзікі тунец.
**11.35** Шаша праз пекла.
**12.20** Міжнародны аэрапорт Дубай.
**13.10, 0.40, 3.45** Навуковыя недарэчнасці.
**14.00** Апакаліпсіс. Другая сусветная вайна.
**14.45** Вялікія рэйды Другой сусветнай вайны.
**15.30** Сіла племені.
**16.20** Я — Малала.
**19.30** Сапраўдны суперкар.
**21.00, 0.55, 4.00** Дзікае надвор'е.
**21.45, 1.40, 4.50** Светы, якія бушуюць.
**22.35** Жах у нябёсах.
**23.20, 2.30** Паранармальнае.
**0.10, 3.15** Зрабі або памры.

### Discovery

**8.00** Буйны ўлоў.
**9.00, 22.00** Востраў.
**10.00** Паляўнічыя на атруту.
**11.00, 4.40** Ліквідатар.
**12.00** Скарбы з каморкі.
**13.00** Паляўнічыя на старызну.
**14.00** Мяцежны гараж.
**15.00, 23.00, 2.55, 6.20** Браты Дызель.
**16.00, 5.30** Мотарэстаўрацыя.
**17.00** Загадкі планеты Зямля.
**0.00, 7.10** Даліны смерці.
**1.00** Аляска: апошні рубеж.
**2.00** Курс выжывання.
**3.50** Апошнія жыхары Аляскі.

## У свеце жывёл

### 27 ТЫСЯЧ ДОЛАРАЎ — НА ВЯСЕЛЛЕ БЫКА І КАРОВЫ

**У штаце Гуджарат на захадзе Індыі адбылося вяселле быка і каровы, на якое гаспадары жывёл выдаткавалі 27 тысяч долараў. На ўрачыстасць, якая прайшла ў адной з мясцовых вёсак, было запрошана больш за 300 чалавек.**



Уладальнікі жывёл наладзілі пышную цырымонію, каб прадэманстраваць важную ролю кароў для культуры Індыі і яе грамадзян. Таксама яны хацелі тым самым выступіць супраць забою гэтых жывёл на тэрыторыі краіны. Госці ўрачыстасцяў у суправаджэнні аркестра калонай прайшлі ад вёскі «жаніха» па мянушцы Арджун і «нявесты» — Пунам. Саміх жывёл перавозілі на аўтамабілі. Мерапрыемства прайшло ў адпаведнасці з традыцыйнымі індыйскімі рытуаламі.

Карова шануецца ў індуізме як святая жывёла і ўвасабляе дабрачыннасць і багацце. У Індыі забойства гэтых звяроў забаронена, выключэннем з'яўляюцца толькі штаты Керала і Заходняя Бенгалія.

### АБДЫМІ ВОМБАТА

**На тасманскім востраве Фліндэрс (Аўстралія) адкрылі конкурс на вакансію абдымальніка асірацелага дзіцяняці вомбата.**



Тэрмін меркаванага працаўладкавання складзе толькі тры дні, на працягу якіх паспяховы кандыдат павінен будзе жыць на востраве, забаўляць і лашчыць звярка па мянушцы Дэрэк. Прадстаўнік турыстычнай арганізацыі, якая адкрыла вакансію, расказаў, што дзіцяня знаходзілася ў сумцы маці, якую збіла машына. Калі яго знайшлі і даставілі да ветэрынараў, маленькі вомбат важыў толькі 700 грамаў. У апісанні вакансіі ўдакладняецца, што саіскальнік павінен пражываць у Аўстраліі і быць гатовым да пераезду на востраў на тэрмін працаўладкавання.

### ЛЮБОЎ ДА ЯЛАВІЧЫНЫ ДА ДАБРА НЕ ДАВЯЛА

**Уладальнік фермы ў амерыканскім штаце Фларыда і паляўнічы застрэлілі алігатара даўжынёй 4,5 метра і вагой 360 кілаграмаў, каб выратаваць ад яго статак кароў, якімі харчаваўся драпежнік.**



Фермер Ці Лайтсей і прафесійны паляўнічы Блэйк Годвін выявілі, што звер, які жыве ў адным з мясцовых вадаёмаў, нападаў на статак фермера. Паводле слоў жыхароў Фларыды, калі каровы прыходзілі на вадапой, алігатар зацягваў адну з іх на дно. Лайтсею і Годвіну давялося выкарыстоўваць трактар, каб выцягнуць мёртвага алігатара з вады і зрабіць з ім некалькі фотаздымкаў. Мужчыны плануюць ахвяраваць мяса драпежніка і зрабіць пугала з яго скуры, каб дэманстраваць на выстаўках паляўнічых трафеяў. Жыхары штата Фларыда нярэдка цярпяць ад умяшання алігатараў у іх жыццё

## УБАЧЫЛА, ЖАХНУЛАСЯ І... ПАХУДЗЕЛА!

*На мінулым тыдні ў плане займальных інфанагод асаблівa вылучыліся прадстаўніцы прыгожага полу з Вялікабрытаніі. Зрэшты, аб усім па парадку.*

**Першая «зоркай» навін стала жыхарка графства Хартфордшыр, якая з-за лішняй вагі не змяшчалася на адным сядзенні ў самалёце. Яна пахудзела на 83 кілаграмы! Пасля гэтага дама выдаткавала суму каля 11 тысяч долараў на выдаленне павіслай скуры, піша Daily Mail.**



24-гадовая Эмбер Роўз зразумела, што павінна скінуць вагу пасля таго, як яе папрасілі набыць адразу два авіябілеты: з-за сваіх памераў дзяўчына не магла бяспечна ляцець у адным крэсле. Брытанка вагой 159 кілаграмаў прыйшла да высновы, што атлусценне стала вынікам яе няправільнага харчавання, пасля таго як адзін з сяброў апублікаваў у інтэрнэце здымак яе штодзённага рацыёну. Убачыўшы ўласнае меню і фігуру збоку, Роўз пачала наведваць трэнажорную залу і скарацілa колькасць спажываных калорый. Пасля пахудзення дзяўчына адважылася на аперацыю па выдаленні лішняй скуры на целе. «Вельмі хачу зноў трапіць на той жа рэйс летам, а потым яшчэ і пахваліцца сваім новым целам у бікіні», — падзялілася яна.

## ЛЮБЛЮ Я ПАСТУ... ЗА РУЛЁМ

**Другой «зоркай» стала невядомая у чырвоным Ford Fiesta. Яна апынулася ў цэнтры ўвагі брытанскай прэсы пасля таго, як на камеру з аўтамабіля, які праязджаў побач, было знята, як жанчына за рулём есць пасту з вялікай талеркі.**



Па сведчанні двух відавочцаў незвычайнага аўтаінцыдэнту, машына рухалася па хуткасці 50 міль у гадзіну (больш за 80 км/г). Паводле іх слоў, жанчына адной рукой трымала відэлец, а другой талерку. Пры гэтым яна была так захоплена ежай, што не заўважала, што за ёй назіраюць. Мужчыны, якія знялі відэа, лічаць, што гэта «па-вар'яцку» і «небяспечна для навакольных». Адзін з мужчын сказаў, што першы раз за 11 гадоў свайго вадзіцельскага стажу бачыў, каб так адкрыта абедалі за рулём.

## ХАЧУ, ЯК ПАМЕЛА

**Трэцяй «зоркай» навін стала жыхарка Ліверпуля, якая выдаткавала больш за 28 тысяч долараў на пластычныя аперацыі, каб дамагчыся падабенства з амерыканскай актрысай і мадэллю Памелай Андэрсан, паведамляе зноў жа Daily Mail.**



31-гадовая Кэралін Андэрсан за 16 гадоў перанесла дзевяць аперацый на грудзях, павелічэнне вуснаў і адбельванне зубоў дзеля вонкавага падабенства са сваім ідэалам. Яна кожныя шэсць месяцаў робіць ін'екцыі ботаксу ў верхнюю частку твару. Брытанка пастаянна наведвае салярый, каб дамагчыся такога ж, як у «зоркі», адцення скуры. З-за гэтага ў дзяўчыны пачаліся праблемы са здароўем. Нягледзячы на складанасці, Андэрсан плануе зрабіць яшчэ некалькі пластычных аперацый. «Апантанасць адным чалавекам можа выглядаць дзіўна, але я гатовая на ўсё, каб атрымаць такую ж знешнасць», — сказала брытанка ■

## Нядзеля, 17 красавіка

### Беларусь 1

**7.20** Меладрама «Даша». 2-я серыя.
**9.00, 12.00, 15.00** Навіны.
**9.10** «Арсенал».
**9.40 Серыял «Сваты».**
**11.05** «50 рэцэптаў першага».
**12.10** Навіны. Цэнтральны рэгіён.
**12.35 Меладрама «Чаго хочуць мужчыны».**
**14.25** Каробка перадач.
**15.15** Твой горад.
**15.30** Eurovision. Вынікі тыдня.
**15.50** Вакол планеты.
**16.35** Тайны следства.
**17.10 Меладрама «Вяскоўшчына».**
**20.35** Навіны надвор'я.
**21.00** Галоўны эфір.
**22.10** Клуб рэдактараў.
**22.50 Камедыя «Знарок не прыдумаеш».**

### Беларусь 2

**7.05 Серыял «Класная школа».**
**7.30 Серыял «Хто ў доме гаспадар?»**
**9.25** «Арол і рэшка. Шопінг». Трэвел-шоу.
**10.30** «Універ-шэф».
**11.10, 20.00** Тэлебарометр.
**11.20** Ваша лата, Пяцёрачка.
**11.50** «Lady Блог». Модны праект.
**12.30 Серыял «Шчаслівыя разам».**
**14.20 Баявік «Прафесіянал».**



**16.25 Трылер «Прарок».**
**18.10 Трылер «Лара Крофт: Раскрадальніца грабніц».**
**20.35** Кіпень.
**21.10 Дэтэктыў «Падмані мяне».**
**22.00** Спортлато 5 з 36, КЕНО.
**22.10** Хачу ў тэлевізар!
**22.15 Серыял «Косці».**

### Беларусь 3

**8.00, 12.00, 14.05** «Калейдаскоп».
**8.15** «Размаўляем па-беларуску». Тэлевіктарына.
**8.20 «Казус Кукоцкага». Драма. «Дзяўчынкі выраслі».**
**9.10** Леанід Млечын прадстаўляе. «Сусветныя тайны». «Імператарскі цягнік. Ракавы маршрут». Дак. фільм.
**9.50** Аляксандр Баль. Канцэрт «Подых струн».
**10.45** «Напера́д у мінулае».
**11.10** Хіт-парад «Сто песень для Беларусі».
**12.15** «Музеі Беларусі». Магілёўскі абласны краязнаўчы музей імя Е.Р. Раманава. Магілёўскі гарадскі музей этнаграфіі.
**12.45** «Святыні Беларусі». Касцёл Узвышэння Святога Крыжа (каталіцкі храм Мінска).
**13.10** «Гітара па крузе». Песеннік, паэт, аўтар-выканаўца Барыс Палоскін.
**14.25** «Любімыя ВІА». Канцэрт з удзелам папулярных ВІА 70-х, 80-х гадоў.
**15.30 «Халоднае лета пяцьдзесят трэцяга...» Драма.**
**17.10** «Кіно і час». Першая сусветная вайна.
**17.50 «Знак Венеры». Камедыя.**
**19.25** «Камертон». Народны артыст Расіі Мікіта Міхалкоў.
**19.55 «Казус Кукоцкага». Драма. «Жывы ці мёртвы».**
**20.40** «Калыханка».
**21.00** «Апошні герой». Творчасць Віктара Цоя.
**22.05 «Іголка». Драма.**
**На тэлеканале «Беларусь 3» па Брэсцкай, Гомельскай і Гродзенскай вобласці з 11 па 17 красавіка на працягу адной гадзіны будуць трансляваць абласныя тэлепраграмы:**
*панядзелак, серада, пятніца — з 18.55 па 19.55;*
*аўторак, чацвер — з 18.50 па 19.50.*

### Беларусь 5

**7.30, 23.05** PRO спорт. Навіны.
**7.40** Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Чэлсі» — «Манчэстэр Сіці».
**9.30** Футбол. Беларусбанк — чэмпіянат Беларусі. 3-ці тур. «Шахцёр» (Салігорск) — «Дынама» (Мінск).
**11.15** Футбол. На шляху да Еўра-2016. Відэачасопіс.
**11.45** Баскетбол. НБА. Плэй-оф.
**13.30** Авертайм.
**14.00** Тэніс. Кубак Федэрацыі. Расія — Беларусь.
**20.00** Бокс. Алімпійская кваліфікацыя. Фіналы.
**23.15** Баскетбол. Адзіная Ліга ВТБ. «Цмокі-Мінск» — БК «Ніжні Ноўгарад».

### АНТ

**7.00** «Нядзельная раніца».
**8.00, 9.00, 16.00** Нашы навіны.
**9.05** «Нядзельная пропаведзь» (з субцітрамі).
**9.20** М/с «Смяшарыкі. ПІН-код».
**9.35** «Бесталковыя нататкі».
**9.55** «Пакуль усе дома».
**10.45** «Фазэнда».
**11.20** «Голас. Дзеці».
**13.10 Фэнтэзі «Хронікі Нарніі: Заваёўнік Зары».**
**15.10** «Госці па нядзелях».
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** «Святочны канцэрт да Дня касманаўтыкі».
**17.55** «Без страхоўкі».
**20.00** Контуры.
**21.05** «Клуб Вясёлых і Знаходлівых». Вышэйшая ліга.
**23.10** «Што? Дзе? Калі?» Вясновая серыя гульняў.
**0.15** «Кранштат 1921».

### СТБ

**6.20 «Студэнты». Серыял.**
**7.05** «Самая карысная праграма».
**7.55** «Скардзіцца дазваляецца».
**8.15, 16.50** «Аўтапанарама».
**8.40 Маст. фільм «Кіроўца аўтобуса».**
**11.00** «Вялікае снеданне».
**11.40** «Дарагая перадача».
**11.50 «Салдаты 10». Серыял.**
**13.30, 16.30** «24 гадзіны».
**13.40, 0.35 Драма «Кур'ер».**
**15.20** «Чалавек года Міншчыны».
**16.00** «Цэнтральны рэгіён».
**17.20** «Ваенная тайна».
**19.30** «Тыдзень».
**20.25 Маст. фільм «Чужы білет».**
**22.15** «Нам і не снілася».

### МІР

**6.00** «Мільён пытанняў пра прыроду».
**6.15, 8.35** М/ф.
**8.05** «Нітка да ніткі».
**9.00** «Культпрасвет».
**9.30** «Чаму я?»
**10.00, 16.00** Навіны (бягучы радок).
**10.15 Серыял «Правілы жыцця».**
**13.30** «Трэш-тэст».
**14.00 Маст. фільм «Ці не паслаць нам... ганца?».**
**16.15, 22.00 Серыял «Справа была на Кубані».**
**21.00** «Разам».
**0.15 Серыял «Адчайныя хатнія гаспадыні».**
**5.10** «З нагоды». Водар любові: гісторыя парфумерыі.

### РТР—Беларусь

**7.00** «Пакой смеху».
**7.40 Маст. фільм «Ненавіджу».**
**11.00, 14.00** Весткі.
**11.15** «Сам сабе рэжысёр».
**12.05** «Смехапанарама Яўгена Петрасяна».
**12.35** «Ранішняя пошта».
**13.10** «Мая планета».
**14.15 Маст. фільм «Цілі-цілі цеста».**
**17.35** «Танцы з зоркамі».
**20.00** Весткі тыдня.
**21.30** Ток-шоу «Што адбываецца».
**22.30** «Пародыі! Пародыі! Пародыі!»
**23.50** «Нядзельны вечар з Уладзімірам Салаўёвым».

### НТБ—Беларусь

**5.50** «Астрапрагноз».
**5.55, 8.20 Серыял «Сужэнцы».**
**8.00, 10.00, 16.00** Сёння.
**8.50** «Іх норавы».
**9.25** «Ядзім дома».
**10.25** «Першая перадача».
**11.05** «Цуд тэхнікі».
**12.00** «Дачны адказ».
**13.05** «НашСпажыўНагляд». «Не дай сябе падмануць!»
**14.15** «Паедзем, паядзім!»
**15.05** «Наш космас».
**16.20 Серыял «Мент у законе».**
**18.10** «Следства вялі...»
**19.00** «Акцэнты тыдня»
**19.55 Маст. фільм «Не бойся, я з табой! 1919».**
**21.50 Серыял «Марскія д'яблы. Смерч. Лёсы».**
**23.25 Серыял «Хмураў».**

### 8 канал

**9.00, 15.25, 19.05, 23.55** «На двор'е».
**9.05, 15.30** «Мультпарад».
**10.00** «Адшукваецца адпачынак».
**10.30, 15.15, 16.45, 21.00** «Хатняя крама».
**10.45** «Мой любімы гадаванец».
**11.15 Серыял «Камісар Рэкс».**
**13.00 Фантастыка «Абуджэнне сілы».**
**16.30** «Кінабланкнот».
**17.15 Серыял «Чыста англійскае забойства».**
**19.10 Меладрама «Экспрэс у Маракеш».**
**20.50** «Вечарніца».
**21.05 Прыгоды «Гэты новы свет».**

### ВТБ

**6.00, 4.00** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**6.30** «Здаецца! З рамонтам».
**7.30** М/ф «Ека».
**7.45** М/ф «Смяшарыкі».
**8.00** М/ф «Маша і мядзведзь».
**8.30, 13.00** «Ералаш».
**9.00** «Хто каго на кухні».
**9.30, 3.30** «Лаві момант».
**10.00, 1.00** «Турбаміксер».
**12.00** «Паспець за 24 гадзіны».
**13.30** М/ф «Шрэк 3».
**15.00** «Два галасы».
**17.00** Фантастыка «Трансформеры».
**19.30** «Уральскія пельмені».
**21.00** Фантастыка «Трансформеры: Помста палых».
**0.00** «Кіно ў дэталях».
**4.30** Скетч-шоу «6 кадраў».
**5.30** «Дурні і дарогі».

### Культура

**6.30** «Еўранькюс».
**10.00** «Звычайны канцэрт з Эдуардам Эфіравым».
**10.35** «Пацалунак». Маст. фільм.
**11.40** «Легенды сусветнага кіно». Глорыя Свенсан.
**12.10** «Расія, любоў мая!» «Шаманы Хакасіі».
**12.40** Геніі і ліхадзеі. Трафім Лысенка.
**13.10** «Некранутая прырода Бразіліі». Дак. серыял.
**14.05** «Што рабіць?»
**14.50** «Абульхасім Фірдаусі». Дак. фільм.
**15.00** Канцэрт Нацыянальнага акадэмічнага аркестра народных інструментаў Расіі імя М.П. Осіпава ў КЗЧ.
**16.15** «Пешшу...» Масква касмічная.
**16.45** «Шукальнікі». «Куфар імператрыцы».
**17.35** Творчы вечар Гары Бардзіна.
**18.40** «Пачатак цудоўнай эпохі».
**18.55** Двайны сеанс. «Лёгкае жыццё». Маст. фільм.
**20.25** «Шлюб па-італьянску». Маст. фільм.
**22.10** «Блізкае акружэнне Уладзіміра Хаціненкі».
**23.05** Нацыянальная тэатральная прэмія «Залатая маска-2016». Цырымонія ўзнагароджання лаўрэатаў.
**1.40** «Ікар і мудрацы». «І смех і грэх». М/ф для дарослых.
**2.00** — Прафілактыка.

### Настальгія

**6.00** Дак. фільм «Вялікі мысліфікатар».
**6.20, 7.45, 9.40, 11.00, 11.40, 13.20, 14.20, 15.50, 17.30, 18.40, 20.35, 22.20, 1.00, 2.20, 3.40, 5.00** Музычная настальгія.
**6.50, 1.15** Маст. фільм «Прызнанне ў каханні».
**8.00** «Народжаныя ў СССР». Найлепшае. Ала Пугачова. 2014 год.
**9.00, 3.00** «Мінулы час».
**10.00** «Колба часу».
**11.30** «Сядзі і глядзі». Музычна-парадыйная праграма. 2005 год.
**12.00** «Зямля—Паветра». Група «Акварыум». 2003 год.
**13.45** Дак. фільм «Эканоміка ў пошуках ісціны».
**14.10** «Навіны дня. Хроніка нашых дзён». Людзі перабудовы. 1991 год.
**14.40** М/ф «Высокая горка».
**15.00** «Быў час». 2009 год.
**16.00** Маст. фільм «Маналог».
**18.00** «Акулы пяра». Вячаслаў Бутусаў.
**19.20** «Зямля—Паветра». Аляксандр Маршал. 2003 год.
**21.00** Маст. фільм «Прахіндзіяда, або Бег на месцы».
**0.00** «Яловая субмарына» з Аляксандрам Ліпніцкім: «Гісторыя рускага рока. Аляксей Хвасценка». 2006 год.
**2.40** «Сакрэты прыроды». «Абарыгены Антарктыды». 1980 год.
**5.10** Дак. фільм «І шчасця ў асабістым жыцці».

### EuroSport 1

**4.00, 8.45** Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат Еўропы. Жанчыны.
**5.00, 9.30** Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат Еўропы. Мужчыны.
**6.00, 20.15** Снукер. Чэмпіянат свету.
**8.00, 14.00** Супербайк. Чэмпіянат свету.
**10.45** Конны спорт. Global Champions Tour.
**12.00** Суперспорт. Чэмпіянат свету.
**13.00, 15.00** Аўтаспорт. Серыя WTCC.
**16.00** Веласпорт. Гонка Amstel Gold.
**18.00** Аўтаспорт. Гонкі на трываласць.
**0.00, 2.00** Футбол. Чэмпіянат MLS.

### Камедыя

**0.30** Меладрама «Я ніколі не буду тваёй».
**2.15** Камедыя «Шалёныя грошы».
**4.00** Камедыя «Два ў адным».
**5.35** Камедыя «Пра што маўчаць дзяўчаты».
**7.10** Меладрама «Пастка для нявесты».
**8.50** Камедыя «Закаханая ведзьма».
**10.40** Меладрама «Даю год».
**12.25** Камедыя «Чалавек-эльф».
**14.00** Камедыя «Дзённік кар'ерысткі».
**15.35** Скетчкам «Паміж намі».
**16.00** Камедыя «Два светы».
**17.50** Камедыя «Амаль замужам».
**19.30** Меладрама «Сведка на вяселлі».
**21.15** Камедыя «Няўдачлівыя».
**22.55** Камедыя «Неўпапад».

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**9.45** «Вокладка».
**10.20** «Паненка і кулінар».
**10.55** «Далёка і яшчэ далей».
**11.50, 1.05** «Куля-дурніца». Серыял.
**15.15** «Жонка. Гісторыя каханні».
**16.35** «Вікінг». Баявік.
**20.00, 4.00** «Без падману».
**20.55** «Мулен Руж». Мюзікл.
**23.05** «Асцярожна, махляры!»
**23.35** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.
**4.40** «Куміры. Назад у СССР». Дак. фільм.

### ТБ1000

**6.10, 18.10** Драма «Куды прыводзяць мары».
**8.10, 2.10** Меладрама «Эрын Брокавіч — прыгожая і рашучая».
**10.25** Прыгоды «Джуманджы».



**12.10, 4.25** Меладрама «Жонка вандроўніка ў часе».
**14.00** Камедыя «28 дзён».
**15.50** Драма «Доўгія змовіны».
**20.10** Драма «Залаты век».
**22.10** Меладрама «Свет навокал».
**0.10** Драма «Перапыненае жыццё».

### ТБ1000 Рускае кіно

**6.20** Камедыя «Бармен».
**8.15, 3.00** Камедыя «Смайлік».
**10.10, 4.30** Драма «Гадзіна пік».
**12.20** Дэтэктыў «Гатэль «У загінулага альпініста».
**14.10** Меладрама «Вораг нумар адзін».
**16.10** Камедыя «Атамны Іван».
**18.20** Драма «Я не вярнуся».
**20.20** Камедыя «Нерэальнае каханне».
**22.10** Драма «Палонны».
**23.40** Баявік «Антыкілер».
**1.40** Драма «Доўгае шчаслівае жыццё».

### National Geographic

**6.00, 13.35, 5.35** Гульні розуму.
**6.50** Займальная навука.
**7.10** Папулярная навука.
**7.35** Золата ў халоднай вадзе.
**8.20, 15.30** Інстынкт выжывання.
**9.10** Золата Юкана.
**10.00** Будаўнічая ліхаманка.
**10.45** Дзікі тунец.
**11.35** Шаша праз пекла.
**12.20** Міжнародны аэрапорт Дубай.
**13.10, 0.40, 3.45** Навуковыя недарэчнасці.
**14.00** Апакаліпсіс. Другая сусветная вайна.
**14.45** Вялікія рэйды Другой сусветнай вайны.
**16.20** Каралі шахт.
**17.50** Даследчык 2.0.
**18.40** Французск-бунтар.
**19.30** Прарыў.
**20.10** Морган Фрыман. Гісторыі пра Бога.
**21.00, 0.55, 4.00** Землетрасенне на Эверэсце.
**21.45, 1.40, 4.50** Погляд знутры.
**22.35** Космас. Прастор і час.
**23.20** Паранармальнае.
**0.10, 3.15** Зрабі або памры.
**2.30** Эвакуацыя Зямлі.

### Discovery

**8.00, 15.00** Курс выжывання.
**9.00, 1.00** Аляска: сям'я з лесу.
**10.00** Апошнія жыхары Аляскі.
**11.00, 4.40** Аляска: апошні рубеж.
**12.00** Праклён ледзянога золата.
**13.00, 20.00** Залатая ліхаманка.
**14.00** Востраў.
**16.00** Не спрабуйце паўтарыць.
**17.00, 5.30** Браты Дызель.
**21.00** Уцёкі з Алькатраса.
**22.00** Даліны смерці.
**23.00** А ты б выжыў?
**0.00** Не спрабуйце паўтарыць.
**2.00** Мяцежны гараж.
**2.55** Паляўнічыя на старызну.
**3.50** Паляўнічыя на атруту.

■ Здароўе-2020

# СЕМ ЗАДАЧ НА ПЯЦЬ ГАДОЎ

**Дзяржаўная праграма «Здароўе народа і дэмаграфічная бяспека на 2016—2020 гады», адказным заказчыкам якой упершыню выступае Міністэрства аховы здароўя, мае на мэце захаваць стабільную колькасць насельніцтва і дабіцца большай працягласці жыцця.**



Фота БЕЛТА.

Да гэтага ў краіне ўжо рэалізаваныя дзве Нацыянальныя праграмы дэмаграфічнай бяспекі — 2005—2010 і 2011—2015 гадоў. Асноўныя задачы, якія ў іх ставіліся, удалося выканаць. Гэта зніжэнне паказчыка смяротнасці і стабілізацыя каэфіцыента нараджальнасці на ўзроўні 12,6 на 1000 насельніцтва. Пра планы на наступныя гады расказвае **намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення арганізацыі медыцынскай дапамогі Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь Таццяна МІГАЛЬ**:

— У аснову новай праграмы «Здароўе народа і дэмаграфічная бяспека Рэспублікі Беларусь» мы закладвалі Еўрапейскую стратэгію прафілактыкі і барацьбы з неінфекцыйнымі захворваннямі, Глабальны план дзеянняў па прафілактыцы неінфекцыйных захворванняў і барацьбе з імі да 2020 года, еўрапейскую палітыку «Здароўе-2020» і мінскую дэкларацыю па выніках міжнароднай міністэрскай канферэнцыі «Ахопліванне ўсіх этапаў жыцця ў кантэксце палажэнняў палітыкі «Здароўе-2020». Асноўная мэта праграмы — **далейшае ўтрыманне стабільнай колькасці насельніцтва, павелічэнне чаканай працягласці жыцця да 74,6 года, умацаванне здароўя з моманту нараджэння да пажылога ўзросту.** Дабівацца такіх мэт будзем праз рэалізацыю сямі падпраграм — «Сям'я і дзяцінства», «Прафілактыка і кантроль неінфекцыйных захворванняў», «Папярэджванне і пераадоленне п'янства і алкагалізму», «Туберкулёз», «Прафілактыка ВІЧ-інфекцыі», «Знешняя міграцыя», «Забеспячэнне функцыянавання сістэмы аховы здароўя Рэспублікі Беларусь». Дакладна прапісаныя задачы дазволяць сканцэнтраваць рэсурсы — і кадравыя, і матэрыяльныя — на рашэнні самых важных праблем...

**Наогул універсальнага рэцэпта палітыкі павышэння нараджальнасці не існуе. Тое, што спрацавала ў адной краіне, не спрацуе ў другой.**

Такім чынам, праграма прадугледжвае матывацыю моладзі на больш раннае стварэнне сям'і з большай колькасцю дзяцей. **Сумарны каэфіцыент нараджальнасці павінен скласці ў 2020-м 1,75 дзіцяці на адну жанчыну** (сёння — 1,68). Наогул універсальнага рэцэпта палітыкі павышэння нараджальнасці не існуе. Тое, што спрацавала ў адной краіне, не спрацуе ў другой. Меры, якія прымяліся ў нас дагэтуль, аказаліся эфектыўнымі: удалося павялічыць нараджальнасць цягам апошніх дзесяці гадоў. А таму мы працягнем тлумачыць моладзі, што арыентацыя на позні шлюб, адкладанне нараджэння дзіцяці, няправільная кантрацэпцыя — гэта шлях да бясплоднасці. Сёння трэба больш настойліва казаць і аб тым, што здароўе будучага дзіцяці — гэта не толькі здароўе маці. Тут і здароўе мужчынскае, і сексуальнае, і псіхалагічны клімат у сям'і, і актыўнае даўгалецце.

Плануецца заахвочваць роўны ўдзел бацькоў у выхаванні і доглядзе дзяцей, **распрацаваць прапановы па ўдасканаленні сістэмы дзіцячых дапамог, увесці абавязковы «бацькоўскі» адпачынак пры нараджэнні дзіцяці** (пытанне абмяркоўваецца ў Мінпрацы). Трэба арыентавацца на поўныя сем'і, падтрымліваць моду на шматдзетнасць, фарміраваць устаноўкі на больш ранняю рэалізацыю рэпрадуктыўнай функцыі, прафілактыку і лячэнне захворванняў, якія гэтаму перашкаджаюць. Усе ўмовы для нараджэння здаровых дзяцей, для лячэння і рэабілітацыі ў нас ёсць.

Будуць развівацца новыя паслугі для падлеткаў і моладзі ў галіне рэпрадуктыўнага здароўя, пашырыцца сетка цэнтраў, дружалюбных да палеткаў, якія працуюць сёння ўжо ва ўсіх рэгіёнах. Сёння такіх цэнтраў 50, і цягам наступных пяці гадоў плануецца адкрыць яшчэ 6.

Далейшае развіццё атрымае ўдасканаленне меддапамогі жанчынам рэпрадуктыўнага ўзросту, цяжарным і парадзіхам, ажыццяўленне своечасовай эфектыўнай дыягностыкі прыроджаных і спадчынных захворванняў, аказанне меддапамогі нованароджаным.

Прадугледжана далейшае ўкараненне сучасных метадаў лячэння мужчынскай і жаночай бясплоднасці. Здароўе моцнага полу — наогул асобнае пытанне. Беларускія мужчыны ў большай ступені занятыя шкоднымі прафесіямі, вядуць больш рызыкоўны, нездаровы лад жыцця. У нас па-ранейшаму не надаюць належнай увагі здароваму ладу жыцця хлопчыкаў, нашы мужчыны ўпускаюць час для своечасовай дыягностыкі, і гэта адна з прычын іх высокай смяротнасці. Таму прадугледжаны план прафілактычных і дыспансерных аглядаў. **Падрыхтаваны новыя нарматыўна-прававыя акты па дыспансерызацыі, упор будзе зроблены на захаванне здароўя здаровых, фактары рызыкі, наогул змяніцца сутнасць работы па здаровым ладзе жыцця.**

Важным складнікам становіцца стварэнне адзінай прафілактычнай прасторы для паляпшэння якасці жыцця ўсяго грамадства. Пры гэтым упершыню ў рэалізацыі мерапрыемстваў, скіраваных на ўмацаванне здароўя ад нараджэння да старасці, возьме ўдзел шырокі круг міністэрстваў, ведамстваў і грамадскіх арганізацый.

**Вялікая работа будзе праводзіцца па прафілактыцы курэння, рацыянальным харчаванні са зніжэннем солі і транстлушчаў, развіцці фізічнай актыўнасці, стварэнні спрыяльнага навакольнага асяроддзя, барацьбе з сацыяльна значнымі захворваннямі — туберкулёзам, ВІЧ і алкагалізмам.** Паводле даных сацыялагічных

**У нас па-ранейшаму не надаюць належнай увагі здароваму ладу жыцця хлопчыкаў, нашы мужчыны ўпускаюць час для своечасовай дыягностыкі, і гэта адна з прычын іх высокай смяротнасці.**

даследаванняў, у нас зніжаецца колькасць курцоў, і сёння гэта не больш за 28 працэнтаў дарослага насельніцтва. У грамадстве паступова фарміруецца непрыняцце гэтай звычкі. Комплексная, агрэсіўная работа патрабуецца для зніжэння спажывання алкаголю. Пакуль у нас захоўваецца вельмі высокі ўзровень яго спажывання. Па выніках мінулага года ў нас на душу насельніцтва прыпадала больш за 9 л! Стаўка робіцца на прафілактыку п'янства і алкагалізму, пошук новых эфектыўных метадаў ранняга выяўлення і аказання медыцынскай дапамогі.

Што датычыцца інфекцыйных захворванняў, то акцэнт у дзяржпраграме зроблены на ВІЧ-інфекцыю і туберкулёз. Прынцыпова новым з'яўляецца ўзмацненне работы па выяўленні, папярэджванні туберкулёзу і выпадкаў множнай лекавай устойлівасці.

Калі мы гаворым пра неінфекцыйную паталогію, то маем на ўвазе ў першую чаргу хваробы сістэмы кровазвароту, цукровы дыябет, захворванні органаў дыхання і анкалагічныя, якія з'яўляюцца асноўнай прычынай непрацаздольнасці і заўчаснай гібелі ва ўсім свеце. Рэалізацыя скрынінгавых праграм па ранняй выяўленні анкалагічнай паталогіі (раку шыйкі маткі, прастаты, малочнай залозы і калярэктальнага раку) дапаможа дыягнаставаць анкалагічную паталогію на ранніх стадыях, а значыць, знізіць смяротнасць, паляпшаць якасць аказання меддапамогі і рэабілітацыі. Ранняя дыягностыка анкалагічнага захворвання сёння ўжо не прысуд, а магчымасць ранняга вылечвання. Акрамя таго, будзе ўмацавана «вертыкаль», наладжана цесная сувязь міжраённых і абласных анкалагічных цэнтраў з установамі аховы здароўя агульналячэбнай сеткі.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**
*protas@zviazda.by*

УНП 100008115

**Уважаемые акционеры!**

ОАО «МАПИД» сообщает, что выплата дивидендов будет осуществляться в период **с 10.04.2016 до 31.06.2016.**

Общим собранием акционеров ОАО «МАПИД» установлен следующий порядок выплаты дивидендов:
- работникам Общества, юридическим лицам – путем перечисления на расчетные счета;
- физическим лицам, не работникам Общества – путем перечисления через депозитарий «Лидеринвест» с последующей выплатой. По заявлению акционера – почтовым переводом.
Депозитарий ЗАО «Лидеринвест» располагается по адресу: г. Минск, ул. Я. Мавра, д. 41, оф. 512.
При себе иметь документ, удостоверяющий личность.

**Администрация.**

■ Неасабісты суб'ектыў

# КОШЧЫН ДОМ



## Адкуль гэта неверагодная «катаманія» і чаму мы так лёгка ёй паддаемся?

У СЕЦІВЕ з'явіўся новы трэнд — каціны фас як элемент жаночай прычоскі. Нейкая аматарка вусатых-паласатых пафарбавала валасы ў блакітны колер, на патыліцы зрабіла іх ружовымі і нейкім адмысловым цырульніцкім прыёмам выстрыгла там — зноў жа блакітную — галаву ката. Мяркуючы па ўсім, аддала за гэткі «дызайн» немалыя грошы ў салоне. Цяпер размясціла фота на сваёй старонцы ў сацыяльнай сетцы і збірае тысячы «лайкаў». Не здзіўлюся, калі ідэю падхопяць і нашы цырульні і ўжо гэтай вясной з патыліц нашых дзяўчат будуць пазіраць рознакаляровыя кацiныя пыскі.

Калі і як гэта адбылося, што ці не ўвесь свет нібыта захварэў на катоў? Гэтыя пухнатыя звяркі сталі неад'емнай часткай існавання кожнага, незалежна ад таго, падабаюцца яны табе ці не. «Музей ката» ў сталіцы запрашае на новы сезон; кацiныя кавярні, дзе можна не толькі выпіць кавы ці гарбаты, але і пагладзіць коціка, раскіданыя па ўсім свеце, на нават вельмі сур'ёзных інтэрнэт-парталах і то з'явіліся раздзелы кшталту «міленькія коцікі»...

Што ўжо казаць пра парталы не вельмі сур'ёзныя ды пра сацыяльныя сеткі! Там гэтыя жывёлкі ўвогуле на галоўных ролях. Тысячы гісторый цудоўных выратаванняў, мільёны фота, свае сусветна вядомыя героі. Спачатку «сярдзіты коцік» з нейкага амерыканскага штата — яго вечна незадаволеная пыска на фота стала папулярнай ва ўсім свеце і ў выніку дазволіла гаспадыні разбагацець, бо сувеніры з яго выявай людзі купляюць з вялікай ахвотай. Пасля быў «кот з самымі прыгожымі вачыма» (пакуль невядома, ці скарысталіся гаспадары яго вядомасцю дзеля якога камерцыйнага праекта ці проста ціха радуюцца ашаламляльнаму планетарнаму поспеху свайго гадаванца). Цяпер у сеціве новая гераіня — кошка з расійскага Белгарада, якая сядзіць на вуліцы і чакае гаспадароў ужо год. Яны, пераязджаючы ў іншы горад, пакінулі яе на вакзале, і з таго часу жывёлка сядзіць на адным месцы, нікуды не адыходзячы. Яе ўжо назвалі Хаціка (як таго японскага сабаку, што чакаў памерлага гаспадара дзевяць гадоў), гісторыю пра яе пераклала і надрукавала брытанская газета... Зноў замілаванне, зноў ледзь не слёзы (хоць некаторыя «цынікі» заўважылі, што кошка сядзіць на каналізацыйным люку, які нават зімой цёплы, і проста грэецца, але «цынікаў» вельмі хутка «заткнулі»).

ВЫ толькі не падумайце, што я не люблю кошак. Вельмі нават наадварот — вось якраз цяпер мая Клавіятура Кексаўна (яна ж — Клава), надзвычай раздуранае і нахабнае стварэнне, спрабуе дапамагчы мне пісаць, ловячы лапай курсор на экране. Зрэшты, менавіта таму, што ў мяне кошка жыве, усе гэтыя каціныя «мі-мі-мі» ўжо, мякка кажучы, раздражняюць. А яшчэ я, здаецца, ведаю, адкуль такая неверагодная «катаманія» і чаму мы так лёгка ёй паддаемся.

Нам проста не хапае пяшчоты і цеплыні ад іншых людзей, а сваёй мы не маем з кім падзяліцца. Мы прызвычаіліся існаваць у шалёным сучасным тэмпе, прывыклі і прывучылі тых, хто побач з намі, да зносін халодных і рацыянальных. А тут уключаеш камп'ютар (у лепшым выпадку — прыходзіш у музей ці кавярню) — і вось табе прыгожае, пухнатае. Прыгорнеш яго (няхай сабе і ў думках) да сябе, пачухаеш за вушкам, пачуеш, як задаволена муркае, адчуеш замілаванне — місія выканана. Адчуваеш сябе «чалавечным чалавекам», здольным на праявы нямодных сёння пачуццяў. Можна сабой ганарыцца. І, галоўнае, — ніякай адказнасці. Не трэба нават і ведаць, што «коцік» — жывая істота, прычым істота абсалютна свойская, чалавекам калісьці прыручаная і прывучаная жыць побач. Яе трэба даглядаць, карміць, лячыць, калі захварэе, і толькі пасля ўжо браць на рукі і гладзіць. Не кажучы ўжо пра кінутых, бяздомных жывёлак — навошта глядзець ім у вочы, можна спакойна прайсці міма, бо ты ўжо сёння пашкадаваў кошку, якая чакае гаспадароў, на старонцы інтэрнэту.

ПАЛАТА прадстаўнікоў нядаўна вынесла на грамадскае абмеркаванне праект закона «Аб абыходжанні з жывёламі». Напісаць сваю думку на сайце можа кожны ахвотны. Шчыра кажучы, я была вельмі здзіўлена, калі ўбачыла, як шмат людзей пакінулі свае водгукі. Прычым думкі абсалютна розныя — ад абмеркавання, ці можна забараніць сабакам брахаць ноччу, да кранальных вершаў пра бяздомную кошку, якой патрэбен дом... Калі закон будзе прыняты, мы ўпершыню атрымаем нейкія правілы абыходжання з братамі нашымі меншымі. І адказнасць за іх будзе прапісана там абавязкова.

«Людзі, давайце будзем людзьмі! Кошкі і сабакі жывуць з намі не адну тысячу гадоў, яны нам заўсёды дапамагалі: ахоўвалі, ратавалі, супакойвалі, лячылі. Яны адданымі вачанятамі глядзяць на нас. Іх жыццё кароткае, давайце не будзем рабіць яго яшчэ карацейшым. Мы адказваем за тых, каго прыручылі. Сям'я, дзе з дзіцем гадуецца жывёлка, зможа выхаваць гуманнага, адказнага чалавека»... Закон — дакумент афіцыйны. У яго, зразумела, не ўключаць гэтыя крыху наіўныя, але такія правільныя радкі, якія напісала адна з удзельніц грамадскага абмеркавання.

ЗРЭШТЫ, справа тут не ў тым, што і як будзе напісана ў законе. А ў тым, каб рэальна — не віртуальна, не ў аддаленым доступе — клапаціцца і шкадаваць. Узамен, скажу я вам, атрымліваеш нечакана шмат. Безумоўную любоў і адданасць. Самыя дэфіцытныя і каштоўныя сярод нас, людзей, паняцці.

**Алена ЛЯЎКОВІЧ.** *alena@zviazda.by*

## Открытое акционерное общество «БРАНДКО»

Учетный номер плательщика: 800002642
Орган управления: Юридическое лицо без ведомственной подчиненности
Единица измерения: млн руб.
Адрес: 220102, г. Минск, ул. Варвашени, 18-3а

### БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 31 декабря 2015 года

| АКТИВЫ | Код строки | На 31 декабря 2015 г. | На 31 декабря 2014 г. |
|---|---|---|---|
| **I. ДОЛГОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Основные средства | 110 | 2 070 | 2 086 |
| Нематериальные активы | 120 | 3 | 3 |
| Долгосрочные финансовые вложения | 150 | - | - |
| Отложенные налоговые активы | 160 | 86 | 86 |
| **ИТОГО по разделу I** | **190** | **2 159** | **2 175** |
| **II. КРАТКОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Запасы | 210 | 14 | 14 |
| В том числе: материалы | 211 | 14 | 14 |
| готовая продукция и товары | 214 | - | - |
| товары отгруженные | 215 | - | - |
| Расходы будущих периодов | 230 | 560 | - |
| Налог на добавленную стоимость по приобретенным товарам, работам, услугам | 240 | - | - |
| Краткосрочная дебиторская задолженность | 250 | 52 | 16 |
| Краткосрочные финансовые вложения | 260 | 396 | 396 |
| **ИТОГО по разделу II** | **290** | **1 022** | **426** |
| **БАЛАНС** | **300** | **3 181** | **2 601** |
| **Собственный капитал и обязательства** | **Код строки** | **На 31 декабря 2015 г.** | **На 31 декабря 2014 г.** |
| **III. СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | |
| Уставный капитал | 410 | 441 | 441 |
| Добавочный капитал | 450 | 735 | 735 |
| Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток) | 460 | 345 | 339 |
| **ИТОГО по разделу III** | **490** | **1 521** | **1 515** |
| **IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Долгосрочные кредиты и займы | 510 | 1 644 | 1 029 |
| Доходы будущих периодов | 540 | - | - |
| **ИТОГО по разделу IV** | **590** | **1 644** | **1 029** |
| **V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Краткосрочные кредиты и займы | 610 | - | - |
| Краткосрочная кредиторская задолженность | 630 | 16 | 57 |
| В том числе: | | | |
| поставщикам, подрядчикам, исполнителям | 631 | 6 | 1 |
| по авансам полученным | 632 | - | 29 |
| по налогам и сборам | 633 | 7 | 10 |
| по оплате труда | 635 | - | - |
| прочим кредиторам | 638 | 3 | 17 |
| **ИТОГО по разделу V** | **690** | **16** | **57** |
| **БАЛАНС** | **700** | **3 181** | **2 601** |

### ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ за январь–декабрь 2015 года

